

ДЫЕГА МАРАДОНА БЛІЗКА, ЯК НІКОЛІ **5**

ФРАНТАВЫ ДЗЁННІК ЖУРНАЛІСТА-ЗВЯЗДОЎЦА **11**




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

18 ЛІПЕНЯ 2018 г. СЕРАДА № 135 (28751)


**ЛІЧБА ДНЯ**

**На 4,5 працэнта**

*ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года вырас ВУП Беларусі ў I паўгоддзі, паведамляе Нацыянальны статыстычны камітэт. Згодна з першай ацэнкай, аб'ём ВУП у бягучых цэнах склаў BYN55,8 млрд, або ў супастаўных цэнах 104,5 працэнта да ўзроўню I паўгоддзя 2017 года. Рэальныя наяўныя грашовыя даходы насельніцтва Беларусі ў студзені — маі 2018 года склалі 107,7 працэнта да ўзроўню аналагічнага перыяду 2017-га.*

## КОРАТКА

• Працоўныя пенсіі ў Беларусі ў выніку перарахунку з 1 жніўня павялічацца ў сярэднім на 10 %. Гэта прадугледжана ўказам, які 17 ліпеня падпісаў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка.

• **Сэрвісная зона для грамадзян, якія перасякаюць мяжу, адкрылася ў пункце пропуску «Новая Гута».**



• Удасканаленае колавае шасі з гідрамеханічнай перадачай для мадэрнізаванай сістэмы «Паланэз-М» паспяхова вытрымала дзяржаўныя выпрабаванні.

• **Вучоныя гістарычнага факультэта БДУ адкрылі паселішча старажытных славян канца II — першай паловы V стагоддзя нашай эры, пацвердзіўшы гіпотэзу іх паходжання з тэрыторыі Беларускага Палесся.**

• Авіяпарк «Белавія» папоўняць чатыры новыя Boeing 737 MAX.

• **Беларускія праваахоўнікі за паўгода ліквідавалі больш за 25 інтэрнэт-крамаў наркотыкаў.**


ISSN 1990 - 763X


# Матрос з Каралеўскіх



Ёсць такая вёска ў Мёрскім раёне — Каралеўскія. Тут жыве сапраўдны матрос, які, тым не менш, не мае дачынення ані да мора, ані да караблёў і параходаў. Проста работнікаў паромных пераправаў у нас таксама называюць матросамі. Сяргей РУДАК з Каралеўскіх служыць на пароме і ўжо дваццаць два гады звязвае дзвінскія берагі ў пасёлку Дзісна. Дарога Верхнядзвінск — Празарокі дзякуючы яго парому нашмат карацейшая.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

■ Падпіска-2018

## РЫХТУЕМ БОЧКІ ЛЕТАМ...



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

**Тэлевізары, халадзільнікі, люстры, каровы і парасяты, мангалы, альтанкі, трымеры, мікрахвалёўкі, наборы садовай мэблі і рыштунку, чайнікі, культыватары, прасы, шпалеры...**

**У даўжэзным спісе прызоў, якія «Звязда» разыгрывала сярод падпісчыкаў, не было да нядаўняга часу хіба што бочак — прыгожых, дубовенькіх, у якіх так добра паставіць на зіму той жа хрусткай капусткі, грыбоў, агуркоў, мочаных яблыкаў ці нават віна...**


СТАР. 7


■ Фінансавы выдатнік

## НАША КЕМЛІВАСЦЬ РУБЕЛЬ БЕРАЖЭ

### Што трэба ведаць пра бяспеку банкаўскіх картак

**У Беларусі расце колькасць кіберкрадзяжоў з картак. Але каб скрасці грошы з «пластыку», махляр павінен ведаць як мінімум нумар карты, тэрмін дзеяння і CVV-код з адваротнага боку. Якія яшчэ даныя нельга паведамляць староннім асобам і што рабіць, калі скралі картку, расказвае наш эксперт — дырэктар кампаніі электронных плацяжоў Assist Belarus Вячаслаў СЕНІН.**

### КАРТКІ БЫВАЮЦЬ РОЗНЫЯ

Па звестках Нацыянальнага банка, на тэрыторыі краіны дзейнічае больш за 14 млн картак: сюды ўваходзяць і ўсе зарплатныя карткі, і студэнцкія, і дзіцячыя, і пенсійныя, і іншыя. Каля 70—80 % усяго рынку — тыя самыя зарплатныя карткі.

Бываюць і крэдытныя карткі. Да гэтага віду пластыку трэба адносіць любыя дзеючыя на тэрыторыі краіны карткі растэрміноўкі, а іх, дарэчы, нямала. Напрыклад, «Халва», «Карта пакупак», «Smart-карта». Функцыянал у любой з такіх картак просты — безнаяўныя разлікі. Безумоўна, што банкі краіны імкнуцца дапоўніць любыя карткі рознымі «плюшкамі» накшталт кэшбэку, павышанай працэнтнай стаўкі на астатак сродкаў на банкаўскім карт-рахунку і гэтак далей. Бывае, што картку напаўняюць такімі перавагамі і яна становіцца ці пераходзіць у статус прэміяльнай.


СТАР. 4

# ЯК ДАЦЬ РАДЫ «САНКЦЫЁНЦЫ»?

## Прэзідэнт прыняў з дакладам старшыню Мытнага камітэта

**Днямі на магілёўскім напрамку затрымалі два грузавікі, якія накіроўваліся з Беларусі ў Расію з так званай санкцыйнай прадукцыяй па падробленых дакументах. Суправаджаў іх грамадзянін Расійскай Федэрацыі, які значыўся ў міждзяржаўным вышуку. Ён быў затрыманы, зараз праводзіцца праверка. Гэты факт прагучаў падчас дакладу старшыні Дзяржаўнага мытнага камітэта (ДМК) Юрыя Сянько кіраўніку дзяржавы Аляксандру Лукашэнку.**

Прэзідэнт звярнуўся да старшыні ДМК з некалькімі пытаннямі. Ён пацікавіўся, як ідзе напаўняльнасць рэспубліканскага бюджэту. «Усё ж такі ў вас велізарны пласт падатковага адміністравання», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. За першае паўгоддзе ў рэспубліканскі бюджэт паступіла 4,6 млрд рублёў плацяжоў, якія кантралюе ДМК. Гэта на 33,6 % больш, чым за аналагічны перыяд мінулага года. Як пракаментаваў пасля сустрэчы Юрый Сянько, павелічэнне сумы напаўнення бюджэту адбылося з-за аўтаматызацыі працэсу ўзаемадзеяння мытні і бізнесу, аптымізацыі колькасці дакументаў і росту аб'ёму перавозак тавараў.

Другое пытанне — сітуацыя ў органах мытнага кантролю. «Вы туды прыйшлі з адной добрай мэтай — навесці парадак, бо хапала ў нас там праблем. Вы прафесіянал, спецыяліст, на гэта я і разлічваў, што парадак там будзе наведзены», — звярнуў увагу Прэзідэнт, цікавячыся сённяшнім станам спраў. Аляксандр Лукашэнка таксама адзначыў, што апошнім часам усё радзей і радзей чуваць пра праяўленне карупцыі ў мытных органах. «Хоць я не выключаю, што гэта ў нас там яшчэ не зжыта. Але ўжо таго, што было, напэўна, няма. Хацелася б спадзявацца», — рэзюмаваў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт пацікавіўся таксама, ці атрымалася выйсці на запланаваны ўзровень аптымізацыі мытных органаў. Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка выказаў меркаванне, што «асабліва ў Мытным камітэце скарачаць няма чаго. Гэта орган, які працуе і прыносіць грошы». Па планах з 1 студзеня 2019 года мытня «Мінск-2» увойдзе ў склад Мінскай рэгіянальнай мытні. Колькасць падраздзяленняў на ўзроўні аддзелаў скароціцца з 56 да 45. Вызваляцца 59 штатных адзінак, якія плануецца накіраваць ва ўнутраныя пункты мытнага афармлення, а таксама на граніцу для здзяйснення пашпартнага кантролю ў асобных пунктах пропуску.

Наконт замежных тавараў, якія трапілі пад санкцыі Расіі, Прэзідэнт адзначыў, што гэта наш галаўны боль. Многае зроблена, але часам прыходзіцца чуць, што ў Беларусі дрэнна працуюць з гэтай катэгорыяй прадуктаў. «Ці вырашана гэта пытанне? І, калі гэта не так, нам неабходна смялей пра гэта гаварыць, бо, па інфармацыі спецслужбаў, запраўляюць усімі негатыўнымі працэсамі, звязанымі з «санкцыёнкай» і іншымі пытаннямі, фірмы і кампаніі Расійскай Федэрацыі. Часам буйныя, за якімі стаяць буйныя дзялкі з цяжкімі пагонамі. Гэта таксама неабходна гаварыць, не саромецца. Не мытнікам расійскім гаварыць, а інфармаваць урад і Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі, каб яны там разбіраліся са сваімі».

З моманту ўвядзення расійскім бокам так званых санкцый ДМК выявіў 2,2 тысячы адміністрацыйных правапарушэнняў, заведзена 30 крымінальных спраў па фактах незаконнага перамяшчэння 25 тысяч тон санкцыйных тавараў на суму 40,8 млн беларускіх рублёў. Пры гэтым Юрый Сянько звяртае ўвагу, што зараз увозіцца менш такой прадукцыі.

Дадаткова старшыня ДМК адзначыў, што сёлета былі выяўлены вялікія партыі наркотыкаў. Як правіла, яны правозіліся транзітам у бок Расіі. Літаральна некалькі дзён таму каля Гродна ў пункце пропуску Брузгі быў затрыманы расіянін з 1,1 кілаграма какаіну.

# НА ШЛЯХУ ДА МЭТ

**Як наша краіна рухаецца да выканання Мэт устойлівага развіцця ААН, што адбываецца ў Беларускім саюзе жанчын і як рэалізуецца дэкрэт аб занятасці насельніцтва. Гэтыя тры пытанні абмеркаваў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка разам з Мар'янай Шчоткінай, намеснікам старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі, нацыянальным каардынатарам па дасягненні МУР, старшынёй Беларускага саюза жанчын.**

Кіраўнік дзяржавы нагадаў, што калісьці мы дамовіліся, што будзем садзейнічаць плану ААН у дасягненні Мэт устойлівага развіцця да 2030 года, бо гэта таксама і ў нашых інтарэсах. Згодна з імі, развіццё павінны атрымаць усе краіны, у тым ліку Беларусь. Аляксандр Лукашэнка спытаў нацыянальнага каардынатара, як ідзе работа ў гэтым напрамку.

Таксама Прэзідэнт спытаў пра грамадскую арганізацыю, у якой старшынстве Мар'яна Шчоткіна. На яго думку, гэта вельмі важна, бо, гаворачы пра грамадзянскую супольнасць, маюць на ўвазе і ветэранаў, і моладзь, і членаў прафсаюзаў і Беларускага саюза жанчын... «Гэта асноўная частка грамадзянскай супольнасці Беларусі. Таму я назіраю збоку, як там ідуць справы», — адзначыў кіраўнік дзяржавы і прапанаваў давецаца, як развіваюцца падзеі, з першых вуснаў.

Аляксандр Лукашэнка таксама нагадаў, што даручаў назіраць за рэалізацыяй новай рэдакцыі дэкрэта па стымуляванні занятасці насельніцтва. Прэзідэнт пацікавіўся і гэтай тэмай.

Мар'яна Шчоткіна расказала, што сёння Беларусь займае асаблівае месца ў еўрапейскім рэгіёне і краінах СНД у дасягненні МУР. Мы знаходзімся на лідзіруючых пазіцыях. Пасля размовы з Прэзідэнтам яна ўдакладніла, што за мінулы год створана нацыянальная сістэма кіравання ў галіне МУР. Таксама важна мець магчымасць ацаніць прагрэс на гэтым шляху. Для гэтага да канца года плануецца сабраць усе паказчыкі на адну платформу.

Як каментуе нацыянальны каардынатар, мэты ўстойлівасці — гэта захаванне чысціні паветра, вады, зямлі, рост узроўню дабрабыту людзей і якасці жыцця. І гэтыя асноўныя мэты замацаваныя ў нашых магістральных дакументах.

Зараз распрацоўваецца Нацыянальная стратэгія ўстойлівага развіцця да 2035 года. Тое, што ў яе будзе закладзена, — перспектывы развіцця краіны. Гэта работа ідзе комплексна, структуравана і ў супрацоўніцтве з рознымі ведамствамі. У студзені прапануецца правесці нацыянальны форум па МУР, дзе будуць у тым ліку абмеркаваны прапановы па павышэнні эфектыўнасці стратэгіі.

Мар'яна Шчоткіна таксама лічыць, што вельмі важна перайсці на лакальны ўзровень. Нельга меркаваць толькі па сярэдніх паказчыках. Неабходна глядзець на месцы і вырашаць, якія меры прымаць для развіцця.

Акрамя таго, старшыня Беларускага саюза жанчын расказала, што падчас размовы кіраўнік дзяржавы прапанаваў больш эфектыўна выручаць жанчын на кіраўніцкія пасады ад БСЖ. Тых, хто жадае бачыць сябе і ў гэтым працаваць.

Што наконт дэкрэта аб садзейнічанні занятасці, тут галоўным пытаннем з'яўляецца фарміраванне базы. Зараз яна рыхтуецца, праведзена вучоба па ўсіх рэгіёнах. Мар'яна Шчоткіна заўважае, што вельмі важна, каб не было мінулых памылак, каб з кожным чалавекам размаўлялі. Прапанавана, калі дэкрэт запрацуе са студзеня, ужо з верасня апрабаваць гэтую базу, каб ліквідаваць недахопы.

**Надзея АНІСОВІЧ.**

■ Нашы дзеці

# Дадатковыя групы на беларускай мове

## адкрыюць у мінскіх дзіцячых садках з гэтага навучальнага года

**Усяго па краіне працуе 2678 беларускамоўных груп у садках — 12,2 працэнта ад агульнай колькасці. У Міністэрстве адукацыі запэўніваюць: пажаданні бацькоў стараюцца выконваць. Так, усім упраўленням адукацыі рэкамендавана пры пастаноўцы на ўлік дзяцей, якія маюць патрэбу ў наведванні садкоў, увесці адпаведную калонку, дзе бацькі будуць пазначаць, на якой мове яны хацелі б, каб навучалася іх дзіця.**

— Колькасць груп залежыць перш за ўсё ад попыту. У мінулым навучальным годзе ў сталіцы такіх груп пабольшала на пяць, — расказвае **галоўны спецыяліст аддзела дашкольнай, агульнай сярэдняй і спецыяльнай адукацыі камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама Алена МАКАРЭВІЧ.** — Папярэдні аналіз той інфармацыі, якая паступае са службаў «адно акно», дзе ідзе пастаноўка на ўлік, і вынікі камплектавання паказваюць, што ў гэтым навучальным годзе плануецца павелічэнне колькасці такіх груп яшчэ на пяць. Усім бацькам, хто выказаў такое жаданне, месца для дзіцяці ў групе забяспечваецца. Але неабавязкова гэты садок будзе ў крокавай даступнасці.

Асаблівая ўвага ўдзяляецца выданню падручнікаў для беларускамоўных груп. Пераглядаюцца таксама хрэстаматыі па мастацкай літаратуры, каб там былі больш прадстаўлены творы нашых аўтараў.

— Хачу падкрэсліць, што, нават калі адукацыйны працэс ідзе на рускай мове, гэта не значыць, што там увогуле няма беларускай. Тыпавым навучальным планам прадугледжваецца колькасць гадзін па развіццё маўлення па-беларуску, — заўважае **Альбіна ДАВІДОВІЧ, намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення агульнай сярэдняй, дашкольнай і спецыяльнай адукацыі Мінадукацыі.**

У цэлым па краіне 95,8 працэнта дзяцей ва ўзросце ад трох да шасці гадоў атрымліваюць дашкольную адукацыю. Гэта адзін з самых высокіх паказчыкаў ахопу ў Еўропе. Але ёсць праблема з выдзяленнем месцаў у садках у крокавай даступнасці. Гэта датычыцца абласных цэнтраў, сталіцы. А ў Мінскім раёне нарматыў па забяспечанасці месцамі не выконваецца на 23,6 працэнта. Таксама за першае паўгоддзе 2018-га 6,6 тысячы хлопчыкаў і дзяўчатак не атрымалі пры першым звароце месца ў садку ў Мінскай і Брэсцкай абласцях.

На сёлета запланавана будаўніцтва 17 устаноў дашкольнай адукацыі. Чатыры з іх ужо ўзведзены. Калі казаць пра Мінскую вобласць, то завяршаецца будаўніцтва дзіцячага садка на 230 месцаў у Фаніпалі, а ў трэцім квартале будзе гатовы садок на 150 месцаў у Копішчы. Плануюць узводзіць новыя дашкольныя ўстановы і ў Бараўлянах і Смалявічах.

— Дастаткова запатрабаваны групы кароткачасовага знаходжання. Іх наведвае амаль 42 тысячы выхаванцаў, — дадае Альбіна Давідовіч. — Ёсць групы розных відаў: адаптацыйныя, прагулачныя, вячэрняга знаходжання, выхаднога дня, па падрыхтоўцы дзяцей да школы.

У сельскай мясцовасці запатрабаваны сямейныя садкі. У Мінскай вобласці, напрыклад, іх сем. А вось у сталіцы сямейныя групы не атрымалі папулярнасці сярод бацькоў.

Вострага недахопу выхавальнікаў, на думку Мінадукацыі, не назіраецца. У ведамстве адзначаюць, што павышэнне (хоць і невялікае) заробку, павелічэнне адпачынку да 42 дзён спрацавалі на тое, каб палепшыць сітуацыю з цякучкай кадраў.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ**

■

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## КОЛЬКАСЦЬ АХВЯР ПАВОДКІ Ў ЯПОНІІ ВЫРАСЛА ДА 222 ЧАЛАВЕК

Пры гэтым месцазнаходжанне яшчэ 20 чалавек застаецца невядомым, нягледзячы на тое, што пасля стыхійнага бедства прайшло больш за 10 дзён. Пра гэта паведаміла агенцтва Kyodo ў аўторак, 17 ліпеня. Па-ранейшаму каля чатырох тысяч чалавек застаюцца ў эвакуацыйных пунктах. У пацярпелых раёнах не працуюць крамы, парушаная праца водапровода. Пры эвакуацыйных пунктах адкрыты пункты выдачы гуманітарнай дапамогі. Адкрыты таксама і прыём валанцёраў. Нагадаем, на мінулым тыдні лівневыя дажджы абрынуліся на паўднёва-заходнюю і цэнтральную частку Японіі. Гэта прывяло да паводак і апоўзняў. У некаторых месцах рэкі, якія выйшлі з берагоў, затапілі значныя тэрыторыі.



## ТРАМП ПАСАРАМАЦІЎ МЕРКЕЛЬ ЗА «ПАЎНОЧНЫ ПАТОК — 2» І НАТА

Падтрымка Германіяй будаўніцтва газапровода «Паўночны паток — 2» цяжка сумяшчаецца з членствам краіны ў НАТА, заявіў прэзідэнт ЗША Дональд Трамп у інтэрв'ю тэлеканалу Fox News. У апошні час прэзідэнт ЗША часта выказваўся пра тое, што будаўніцтва «Паўночнага патоку — 2» зробіць Еўропу і ў прыватнасці Германію залежнымі ад Расіі і яе энергарэсурсаў. На прэс-канферэнцыі пасля сустрэчы з прэзідэнтам Расіі Уладзімірам Пуціным у Хельсінкі Трамп паабяцаў, што амерыканскі звадкаваны прыродны газ складзе канкурэнцыю расійскаму паліву ў барацьбе за еўрапейскі рынак. Па сцвярджэнні Трампа, Вашынгтон пакрывае 91 працэнт расходаў на бяспеку Еўропы. «А тым часам Еўропа выкарыстоўвае нас на сваю выгаду ў тым, што датычыцца тарыфаў і ўстанаўлення гандлёвых бар'ераў. Гэта забівае наш гандаль, бо ў мінулым годзе мы страцілі ў выніку каля 151 мільярда долараў», — адзначыў Трамп. На яго думку, еўрапейскія члены НАТА павінны павялічыць свае выдаткі на калектыўную абарону.

## ROLLS-ROYCE ПРАДСТАВІЎ НОВЫ СПОСАБ ПЕРАМЯШЧЭННЯ

Брытанскі вытворца люксавых аўтамабіляў Rolls-Royce прадставіў канцэпт электрычнага лятальнага таксі, піша CNN. Паведамляецца, што апарат зможа развіваць хуткасць да 400 кіламетраў за гадзіну, а максімальная далёкасць яго палёту складзе 800 кіламетраў. Таксі аснасцяць шасцю складанымі прапелерамі, чатыры з якіх будуць засоўвацца ў крылы, каб знізіць узровень шуму падчас палёту. На борце адначасова змогуць знаходзіцца да пяці пасажыраў. Таксама будзе магчымасць перавозкі грузаў і выкарыстання машыны ў ваенных мэтах. Па даных Rolls-Royce, запуск лятальнага таксі плануецца на пачатак 2020-х гадоў.



■ На слыху

# ГРАН-ПРЫ «СЛАВЯНСКАГА БАЗАРУ» ПАЕДЗЕ Ў РУМЫНІЮ

**Узнагароды конкурсу выканаўцаў эстраднай песні былі ўручаныя падчас урачыстай цырымоніі закрыцця XXVII Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску».**

Па выніках двух конкурсных дзён адразу два ўдзельнікі набралі аднолькавую колькасць балаў, а таму ўсё залежала ад вырашальнага голасу старшыні інтэрнацыянальнага прафесійнага журы — кампазітара, народнага артыста Расіі, Малдовы і Украіны Аляксандра Марозава. У выніку Гран-пры конкурсу — «Залатую ліру» і грашовы прыз у памеры 20 тысяч долараў — атрымаў спявак з Румыніі Марчэл Рошка, які на працягу ўсяго творчага спаборніцтва дэманстраваў выдатны музычны густ і віртуознае валоданне голасам.

«Мы спецыяльна трымалі інтрыгу да апошняга і не каментавалі чуткі аб тым, хто пераможа, — адзначыў **старшыня журы Аляксандр МАРОЗАЎ.** — Але, як мне падалося, гледачы салідарныя з нашым выбарам. За сябе скажу так: не мае значэння, сучасная гучыць песня, альбо рэтра, альбо народная, у якім яна стылі і на якой мове, — яе можна выканаць таленавіта або не таленавіта. Калі ты сядзіш у журы і забываеш, што павінен выстаўляць адзнакі, а ўнутры адбываецца такая хімія, калі кожная нота, кожнае слова адгукаюцца ў сэрцы, — вось паказчык».

Што да пераможцы, то Марчэлу Рошку нядаўна споўнілася 28 гадоў і да музыкі малады чалавек мае самае непасрэднае дачыненне. Па прафесіі ён дырыжор, заснавальнік джазавага калектыву пры Нацыянальным музычным універсітэце Румыніі, супрацоўнік аркестра, кампазітар і часты госць на румынскім тэлебачанні і радыё. На «Славянскім базары» ў яго спыталі, што рабіць цяжэй: спяваць альбо дырыжыраваць? «Дырыжыраваць, адначасова


Фота БелТА.

спяваючы», — з гумарам адказаў Марчэл. У спевака наогул рознабаковыя музычныя інтарэсы: так, ён з аднолькавым імпэтам расказвае, як дайшоў да фіналу талент-шоу «Голас Румыніі» і «Х-Фактар» і як працуе рэгентам хору ў адной з цэркваў Бухарэста. «Я вельмі шчаслівы, — прызнаўся ён пасля цырымоніі ўзнагароджвання. — Давялося шмат папрацаваць над сабой, але вынік быў гэтага варты. Адчуваю, што гэта проста мой год, калі ўсё складваецца і атрымліваецца, як марыў. Ці думаў, на што патраціць грашовы прыз? Хутчэй за ўсё, на творчасць: запішу новыя песні, буду рыхтавацца, каб прадставіць сваю краіну на іншых міжнародных конкурсах. «Еўрабачанне»? А чаму б і не, гэта адназначна вялікая культурная падзея і цікавы творчы вопыт!»

1-я прэмія конкурсу выканаўцаў з грашовым дадаткам у 15 тысяч долараў дасталася казахстанцу Амрэ, 2-я прэмія і прыз у памеры 10 тысяч долараў — украінскай спявачцы Міле Ніціч. 5 тысяч долараў і 3-е прызавое месца падзялілі прадстаўніца Польшчы Сільвія і беларус Яўген Курчыч. «Ці засмучаны я вынікам? Па шчырасці, не. Кожны конкурс — гэта карысны вопыт і школа жыцця. Хоць, зразумела, падрыхтоўка, барацьба, чаканне вынікаў — усё гэта насамрэч складана, — падзяліўся ўражаннямі Яўген. — Тым больш што я літаральна з карабля на баль адразу са «Славянскага базару» адправіўся ў родны ўніверсітэт культуры і мастацтваў, дзе выкладаю і ўзначальваю сёлета камісію на ўступных экзаменах».

Акрамя таго, былі ўручаныя некалькі спецыяльных прэмій. Прызы ад Пастаяннага камітэта Саюза Беларусі і Расіі атрымалі беларус Яўген Курчыч і расіянка Аляксандра Карабешкіна. Таксама спявачцы з Расіі — яна, дарэчы, самая юная з сёлетніх удзельнікаў, Сашы ўсяго 18 гадоў — быў уручаны спецыяльны прыз Прэзідэнта Беларусі «Славянская надзея». Прыз ад Міждзяржаўнай тэлерадыёкампаніі «Мір» «Песня — шлях да Садружнасці» дастаўся спявачцы Тамрыко з Грузіі, а спецыяльная ўзнагарода імя Уладзіміра Мулявіна «За найлепшае ўвасабленне нацыянальнай тэмы і высокае выканаўчае майстэрства» сёлета адправіцца на далёкую Кубу з калярытнай Рэбекай Эмбіль.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

# Кнігарня ў новым мікраараёне

**У Віцебску ўчора, 16-га ліпеня, адкрылі кніжную краму «Прамень». Адбылося гэта ў новым мікраараёне Білева-2 — на ўскраіне абласнога цэнтра. Цяпер па кнігі мясцовым жыхарам не трэба будзе ездзіць далёка, бо крама ў крокавай даступнасці.**


Фота БелТА.

У афіцыйнай цырымоніі адкрыцця ўдзельнічалі **намеснік міністра інфармацыі Беларусі Ігар БУЗОЎСКІ,** прадстаўнікі мясцовай улады, творчая інтэлігенцыя.

Паводле слоў Ігара Бузоўскага, грамадзяне нашай краіны ў час інтэрнэту па-ранейшаму цікавяцца друкаванымі кнігамі. І гэта вельмі добрая з'ява. Людзі разумеюць, што кнігі чытаць трэба, бо гэта дазваляе інтэлектуальна і духоўна расці, атрымліваць новыя веды. І кнігі ў ліку іншага даваляюць правільна выхоўваць дзяцей.

Прыемным сюрпрызам для першай пакупніцы стаў падарунак з рук намесніка міністра — кніга перакладаў верша Янкі Купалы «А хто там ідзе» на мовах свету». Выданне сёлета атрымала Гран-пры міжнароднага конкурсу «Мастацтва кнігі» дзяржаў — удзельніц СНД. Яе Ігар Бузоўскі ўручыў жыхарцы мікраараёна, дзе адкрылася крама.

Алена Прорашнева — мама трох дзяцей, раней працавала ў гандлі. У размове з карэспандэнтам «Звязды» адзначыла, што купіла паштоўку ручной работы, каб падарыць яе на дзень нараджэння старэйшай дачцэ. Ёй споўніцца 21 ліпеня 23 гады. У краму прыйшла з малодшым сынам Мацвеем, які скончыў першы клас віцебскай гімназіі № 7. Ён і падпіша сястры паштоўку. Хлопчыку, кажа маці, лёгка даюцца мовы. Таму яна вельмі рада, што ён будзе чытаць твор беларускага класіка на розных мовах. І вельмі ганарыцца тым, што, як убачыла ў кнізе, яе наклад усяго 800 экземпляраў. Яшчэ яна, як ні дзіўна, стала пераможцай у латарэі. Выйграла кнігу Валянціна Пікуля «На задворках вялікай імперыі».

У гонар адкрыцця наведвальнікам давалі 10-працэнтную зніжку — на кніжную прадукцыю.

У новай краме, якая займае 110 квадратных метраў, прадстаўлены шырокі асартымент кніг і канцылярскіх тавараў. Таксама ёсць цацкі, пазлы, наборы для творчасці і многае іншае. Дзякуючы адкрыццю крамы, створаны тры новыя рабочыя месцы.

Дарэчы, «Прамень» стаў дзявятай па ліку ў Віцебску кніжнай крамай сеткі ААТ «Белкніга», 16-м гандлёвым аб'ектам у Прыдзвінскім рэгіёне і 108-м — у Беларусі.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# Білеты паступяць у продаж зімой

**Запаветныя «пуцёўкі» на спаборніцтвы II Еўрапейскіх гульняў у Мінску паступяць у продаж 1 снежня, пра гэта паведаміў менеджар па маркетынгу фонду «Дырэкцыя II Еўрапейскіх гульняў 2019 года» Максім Кашкалда.**

«Білеты можна будзе набыць на адмысловым сайце minsk2019.ticketpro.by. Цэны на іх мы аб'явім у кастрычніку. Пачынаючы з 1 сакавіка білеты на гульні змогуць набыць праз сайт усе ахвотныя з любой краіны свету», — расказаў менеджар. Паводле яго слоў, бліжэй да старту спаборніцтваў білеты можна будзе набыць у касах Мінска і іншых гарадах Беларусі. Іх дызайн ужо распрацаваны і зацверджаны. Па меры прасоўвання прадукцыі будзе прадстаўлены выгляд білетаў цырымоній адкрыцця і закрыцця.

Нагадаем, напярэдадні ў Мінску прайшоў семінар шэфаў місій і семінар для прэс-сакратароў НАК і вядучых СМІ краін Еўропы. У мерапрыемствах прынялі ўдзел прадстаўнікі 49 камандаў, якія будуць спаборнічаць на турніры ў наступным годзе, а таксама практычна 30 прадстаўнікоў масмедыя з Беларусі, Вялікабрытаніі, Венгрыі, Кіпра, Латвіі, Італіі, Нідэрландаў, Польшчы, Расіі, Румыніі, Славакіі, Славеніі, Чэхіі, Украіны, Эстоніі і іншых краін. Вядучых сусветных СМІ прадставілі журналісты расійскага інфармацыйнага агенцтва ТАСС і французскага France-Presse, брытанскіх медыяхолдынгаў ВВС і Reuters, інтэрнэт-выданні, прысвечаныя бізнесу і палітыцы алімпійскага руху Around the Rings, камунікацыйнага агенцтва Mitchell Communications Agency.

Прадстаўнікі дырэкцыі паведамілі гасцям аб інфармацыйных тэхналогіях, якія будуць даступны падчас II Еўрапейскіх гульняў, правілах мытнага афармлення і перавозкі грузаў для прадстаўнікоў сродкаў масавай інфармацыі. На семінары размова таксама ішла аб прыбыцці, ад'ездзе і размяшчэнні журналістаў, акрэдытацыі, арганізацыі работы транспарту для прэсы, аб маркетынгу і білетнай праграме спартыўнага форуму, трансляцыях і вяшчанні, PR-праектах.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

■ Сугучча

# МІЛАЯ СТАРОНКА

**Тэма малой радзімы стане агульнай для пісьменнікаў з Беларусі і Расіі.**

Сёлета асаблівая ўвага ў нашай краіне аддаецца родным мясцінам. Паэты і пісьменнікі таксама не застаюцца ўбаку ад гэтай тэмы, тым больш што для многіх яна займае асаблівае месца ў творчасці. Першы намеснік старшыні Саюза пісьменнікаў Беларусі Алена Стэльмах адзначыла, што літаратары не толькі самі актыўна працуюць на гэтай глебе, але і запрашаюць сваіх расійскіх калег падтрымаць ідэю. Маркуецца арганізацыя круглых сталоў з удзелам творчых асоб абедзвюх краін, а таксама падтрымка для маладых пісьменнікаў, якія найбольш поўна праявяць талент.

Алена Стэльмах звярнула ўвагу, што пры падтрымцы Грамадскай палаты Саюзнай дзяржавы можна значна пашырыць само паняцце малой радзімы і годна ўзнагародзіць найлепшых літаратараў з беларускага і расійскага бакоў.

— На працягу 20 гадоў беларускія аўтары ствараюць кнігі пра свае родныя мясціны, апяваюць іх значнасць, каштоўнасць для кожнага чалавека. Сёлета, я спадзяюся, адбудзецца своеасаблівы агляд дасягненняў плённай літаратурнай працы, — выказалася старшыня.

Грамадская палата Саюзнай дзяржавы з 2018 года аказвае падтрымку Саюзу пісьменнікаў Саюзнай дзяржавы ў выданні часопіса «Белая Вежа», дзе публікуюцца мастацкія творы, навуковыя даследаванні і філасофскія развагі аўтараў краін-суседак.

Старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі, сустаршыня Саюза пісьменнікаў Саюзнай дзяржавы Мікалай Чаргінец расказаў, што гэтай восенню ў Маскве пройдзе яшчэ адзін творчы праект. Круглы стол «Літаратура і песні на службе Саюзнай дзяржавы» збярэ разам пісьменнікаў, паэтаў, выканаўцаў песень, якія змогуць не толькі абмяняцца планамі, але і абмеркаваць магчымыя кірункі супрацоўніцтва на пляцоўках Беларусі і Расіі.

**Рагнеда ЮРГЕЛЬ** ■

■ Стыхія

# Ліпень разбушаваўся

**Ад мінулай пятніцы ў краіне пануе вельмі няўстойлівае надвор'е. Атмасферныя франты нясуць цёплае паветра і адначасова з гэтым — праліўныя дажджы. Не стаў выключэннем і вечар панядзелка. Ужо па сумнай традыцыі «паплыў» Мінск...**

Падрабязнасці паведамілі ў прэсслужбе Міністэрства па надзвычайных сітуацыях.

— На вуліцы Кіжаватава ратавальнікі буксіравалі аўтамабіль, у якім разам з маці знаходзіліся двое немаўлят. У доме № 23 па вуліцы Кірава давялося адпампоўваць ваду з двух пад'ездаў шматпавярховіка. Вецер паваліў дзесяць дрэў, чатыры з якіх упалі на аўтамабілі. А на праспекце Незалежнасці рэкламны шчыт паляцеў проста ў падземны пераход.

Таксама ўжо не першы раз за тыдзень затапіла пешаходную зону па вуліцы Рэвалюцыйнай.

Як паведамілі ў дзяржаўным прадпрыемстве «Мінсктранс», з-за ўмоў надвор'я перыядычна перапыняліся трамвайны і тралейбусны рухі ў розных частках Мінска.

Стыхія таксама прагулялася і па горадзе Горкі Магілёўскай вобласці. Моцны вецер пашкодзіў дах на тэрапеўтычным корпусе цэнтральнай раённай бальніцы. А па Ленінскім бульвары дрэва ўпала на аўтамабіль.

Сярод людзей пацярпелых няма. А 18 ліпеня па краіне зноў аб'яўлены аранжавы ўзровень небяспекі з-за прагназаваных навальніц.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК** ■

# НАША КЕМЛІВАСЦЬ РУБЕЛЬ БЕРАЖЭ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Сёння найбольш распаўсюджаныя прэміяльныя картачныя прадукты — званыя залатыя (Gold, «Голд») і плацінавыя карткі (Platinum). У цэлым, любы беларус пры жаданні можа аформіць сабе такую картку — пытанне ў большасці выпадкаў будзе толькі ў цане, якая даволі моцна адрозніваецца ў розных банках. Але існуюць і яшчэ больш прэстыжныя картачныя прадукты, якія звычайна недаступныя простаму абывацелю. Напрыклад, Visa Infinite, MasterCard World Black Edition, MasterCard World Elite...

### Даведка «Звязды»



**Вячаслаў СЕНІН — дырэктар Assist Belarus. У банкаўскай сферы Вячаслаў прапрацаваў больш за восем гадоў, з 2013 года — у беларускім інтэрнэт-эквайрынгу. Пад яго кіраўніцтвам Assist Belarus запусціў супрацоўніцтва з многімі кампаніямі-лідарамі ў розных сферах бізнесу Беларусі (гасцінічныя паслугі, чыгуначныя перавозкі, білетныя аператары, інтэрнэт-крамы, сэрвісы па дастаўцы ежы, тэлекам-аператары, кветкавыя крамы і іншае), а таксама пачаў падключаць бізнес да анлайн-плацяжоў праз сістэму АІС «Разлік».**

## СІСТЭМА ПАРОЛЯЎ 3D-SECURE

Трэба разумець, што картку ў прынцыпе не варта перадаваць у рукі трэцім асобам і паведамляць ім любыя звесткі пра яе. Плацежныя сістэмы і банкі пастаянна працуюць над тым, каб павысіць бяспеку разлікаў карткай.

**Вельмі важна памятаць, што бяспека сродкаў на карт-рахунку — гэта, у першую чаргу, персанальная адказнасць, і калі вы паводзіце сябе бясклапотна, то, якія б спосабы абароны ў карткі ні былі, усё роўна вы можаце патрапіць у непрыемную сітуацыю.**

Напрыклад, адным з дадатковых спосабаў абароны з'яўляецца 3D-Secure або сэрвіс дадатковай аўтэнтыфікацыі. Гэты сэрвіс з'яўляецца яшчэ адной абаронай карткі перад аплатай. У БЕЛКАРТ ужо запушчаны і актыўна выкарыстоўваецца дадатковы спосаб абароны картак у сеціве — Інтэрнэт Пароль БЕЛКАРТ. Такія спосабы абароны выкарыстоўваюцца пры інтэрнэт-разліках, у тым ліку і на замежных інтэрнэт-сайтах.

Напрыклад, вы хочаце нешта купіць праз інтэрнэт. Пры аплаце ў спецыяльнай форме ўводзіце даныя карткі і запаўняеце яшчэ дадатковыя графы для абароны. Пасля гэтага прыходзіць на нумар мабільнага тэлефона спецыяльны код, які трэба ўвесці, каб прайшла аплата. Калі так атрымалася, што вашы персанальныя даныя карткі апынуліся ў зламысьнікаў, то мабільны тэлефон у вас і толькі туды прыходзіць sms са спецыяльным сакрэтным кодам для аплаты.

## ЗАВЕСЦІ АСОБНЫ КАРТ-РАХУНАК У БАНКУ

Вельмі важна памятаць, што бяспека сродкаў на карт-рахунку — гэта, у першую чаргу, персанальная адказнасць, і калі вы паводзіце сябе бясклапотна, то, якія б спосабы абароны ў карткі ні былі, усё роўна вы можаце патрапіць у непрыемную сітуацыю. А каб гэтага не адбылося, трэба абавязкова выконваць некалькі правілаў бяспекі пры разліках.

Першае, ні ў якім выпадку з зарплатнай карткай нельга ездзіць за мяжу і купляць нешта ў замежных інтэрнэт-крамах. Для гэтай мэты абавязкова завядзіце асобны карт-рахунак у банку і картку да яго. У гэтым выпадку важна разумець прынцыповую розніцу вось у чым.

Часам да зарплатных рахункаў банк выдае дзве карткі. Картка — гэта ключ да рахунку ў банку. І калі ў вас адзін рахунак, але два ключы, то гэта тое самае, што адзін ключ. Калі даныя карткі па неасцярожнасці трапляюць ашуканцам, то другая картка вас не выратуе. Любы з ключоў (картак) дае доступ да грошай на карт-рахунку. Дзве карткі да рахунку зручна, але і выпадкі, калі раптам адна картка згубілася ці выйшла «са строю», тады другая выконвае функцыю запаснай. А бяспека — гэта асобны карт-рахунак і картка да яго.

## ЛІМІТЫ ПАТРАБУЮЦЬ ДЫСЦЫПЛІНЫ

Бывае, што кліенты валодаюць вельмі высокімі ведамі ў пытаннях фінансавай адукаванасці і добра разбіраюцца ў лімітах пры разліку карткай. Але і ў іх узнікаюць пытанні.

Напрыклад, вы ўсталёўваеце сабе ліміт па картцы, што звыш эннай сумы грошай (скажам 30 у. а.) вы разлічыцца не зможаце ці ставіце забарону на разлікі па картцы ў «небяспечных» краінах. І тады, нават калі даныя карткі нейкім чынам атрымаюць ашуканцы, то звыш гэтай сумы ліміту зняць з карт-рахунку яны не змогуць. Такі спосаб абароны выкарыстоўваюць тыя грамадзяне, у якіх адна картка (у тым ліку і зарплатная) на ўсе выпадкі жыцця.

Важна разумець, што ліміты па картках патрабуюць ад вас большай дысцыпліны. Таму што нават у самых прасунутых карыстальнікаў картак могуць быць нюансы. Прыклад з жыцця. Вы ведаеце, што зарплатнай карткай будзеце разлічвацца ўсюды, акрамя скажам Польшчы, Індыі і Тайланда. І ставіце забарону на любыя разлікі ў гэтых краінах. Зрабіць гэтыя рэчы цяпер лёгка самастойна з дапамогай інтэрнэт-банкінгу або мабільнага банкінгу. А калі вы ўсё яшчэ не асвоілі гэты інструмент дыстанцыйнага банкаўскага абслугоўвання (ДБА), то гэта можна зрабіць з дапамогай банкаўскага спецыяліста, напрыклад, пры наведванні аддзялення банка асабіста.

Дык вось, паставілі забарону і забыліся. Прайшло паўгода, вы вырашылі нешта купіць у інтэрнэце, а сайт, на якім хочаце здзейсніць куплю, аказўся польскім. А ў вас забарона на разлікі ў гэтай краіне, і паставілі вы гэтую забарону паўгода таму.

Спрабуеце аплаціць, а аплата не праходзіць. Нервуецеся, тэлефануеце ў банк, задаяце пытанні, просіце зняць ліміты. Потым заходзіце ў інтэрнэт-банкінг і здымаеце згаданую забарону, і толькі пасля гэтага купляеце тое, што хацелі. А калі банк тую забарону здыме не адразу, а толькі, скажам, на працягу трох гадзін або больш? То трэба чакаць. А калі вы ў іншай краіне, то патэлефанаваць у банк — гэта значыць аплаціць роўмінг. Нятаннае задавальненне.

Вось і атрымліваецца, што быццам бы ліміты, забароны — гэта зручна, але патрабуюць высокай дысцыпліны. Працей завесці асобны карт-рахунак, з дапамогай таго ж інтэрнэт-банкінгу, або мабільнага банка, або сэрвісу пераводаў ажыццяўляць пераvod на такую картку. Трэба вам нешта купіць на нейкім сайце на суму пяць долараў? Вы роўна гэтую суму на сваю спецыяльную картку для разлікаў у інтэрнэце і кладзяце. Здзейснілі плацеж, і картка пустая. Нават калі даныя такой карткі атрымалі зладзеі, то грошай там няма, і з'яўляюцца яны тады, калі вам трэба нешта купіць.

## ЗАЎСЁДЫ SMS-АБВЕСТКА

Другім галоўным правілам бяспечнага выкарыстання карткі з'яўляецца падключэнне паслугі sms-абвесткі па руху грашовых сродкаў на карт-рахунку ў банку. Прыйшла зарплата, пенсія, стыпендыя — атрымалі sms з паведамленнем, што пэўная сума залічаная. Схадзілі ў краму, купілі прадукты, разлічыліся карткай — прыйшло на сотавы sms. Гэта зручна. Вы заўсёды ведаеце колькі грошай у вас ёсць, таму што пасля кожнай аплаты аўтаматыка «скажа» рэшту сродкаў.

**Ні ў якім выпадку з зарплатнай карткай нельга ездзіць за мяжу і купляць нешта ў замежных інтэрнэт-крамах. Для гэтай мэты абавязкова завядзіце асобны карт-рахунак у банку і картку да яго.**

А яшчэ бяспека. Таму што калі страцілі картку ці яе ўкралі, а зламыснікі дзесьці знялі з яе грошы ці нешта купілі ў краме, то вам прыйдзе sms з абвесткай. І адразу зразумееце, што вашы грошы крадуць.

У гэтым выпадку трэба тэрмінова блакаваць картку. Ёсць некалькі спосабаў: патэлефанаваць у банк, які выдаў картку, заблакаваць картку з дапамогай інтэрнэт-банкінгу або мабільнага банкінгу або спецыяльнага sms-запыту ў банк аб блакаванні. Вядома, найбольш зручны спосаб — мабільны або інтэрнэт-банкінг.

Тут галоўнае — умець карыстацца гэтым сэрвісам і наяўнасць інтэрнэту, таму што калі выкарыстоўваць спосаб званка ў банк, то можна доўга чакаць адказу аператара, асабліва ў выхадныя дні. Тут усё індывідуальна і залежыць ад канкрэтнага банка, таму што call-цэнтры ва ўсіх розныя.

Для бяспечнага зняцця наяўных грошай у банкамаце трэба памятаць, што, па-першае, заўсёды рабіце гэта ў добра прагляданых месцах, напрыклад у холе атэля. Па-другое, заўсёды чытайце, што з'яўляецца на экране банкамата, бо там могуць быць паказаны розныя банкаўскія камісіі пры зняцці гатоўкі.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# У БАРАЦЬБЕ ЗА ЯКАСЦЬ

Аб'яўлены конкурс на атрыманне прэміі СНД за дасягненні ў галіне якасці прадукцыі і паслуг 2019 года

**Дадзены конкурс праводзіцца з мэтай падтрымкі нацыянальных ініцыятыў і аб'яднання намаганняў дзяржаўных органаў кіравання, накіраваных на павышэнне якасці і канкурэнтаздольнасці прадукцыі або паслуг.**

Прэмія СНД прысуджаецца адзін раз на два гады за дасягненне значных вынікаў у галіне якасці прадукцыі (паслуг), гарантаванне яе бяспекі, а таксама ўкараненне сучасных метадаў менеджменту якасці. У конкурсе могуць прыняць удзел юрыдычныя асобы любой арганізацыйна-прававой формы, якія зарэгістраваныя ў любой дзяржаве — удзельніцы СНД і ажыццяўляюць вытворчасць прадукцыі (акрамя вытворчасці ўзбраення і ваеннай тэхнікі) ці аказваюць паслугі.

Галоўнымі крытэрыямі з'яўляюцца пацвярджэнне высокай якасці прадукцыі або паслугі на працягу не менш як двух гадоў і ажыццяўленне экспарту прадукцыі (паслуг) не менш як дзве дзяржавы — удзельніцы СНД.

Больш падрабязна аб умовах конкурсу чытайце на нашым сайце zviazda.by.

**Сяргей КУРКАЧ**

■ Аўто

# Грошай няма?

## Продажы новых машын за першае паўгоддзе 2018-га выраслі ў разы



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

**Беларуская аўтамабільная асацыяцыя апублікавала вынікі продажаў новых легкавых і камерцыйных аўтамабіляў за першае паўгоддзе бягучага года. Лічбы, скажам шчыра, даволі нечаканыя — асабліва ў параўнанні з апошнімі гадамі.**

Мяркуйце самі: па даных БАА, колькасць набытых у афіцыйных дылераў легкавых і камерцыйных аўтамабіляў у першым квартале 2018 года дасягнула 23 196. Гэта на 70,5 % больш, чым за аналагічны перыяд у 2017-м, а таксама на 92,2 % больш, чым за той жа час у 2016-м.

Лідзіруе француз — кампанія Renault рэалізавала 5845 аўтамабіляў, а гэта на 30 % больш, чым за студзень — чэрвень 2017 года. Далей ідзе LADA, якая прадала 4206 машын, што на 213 % перавышае вынік мінулага года. Трэцяе месца за канцэрнам Volkswagen — 3248 аўто і пяцідзесяціпрацэнтны рост.

Вядома, напрошваецца пытанне — а як там Geely? Кампанія трапіла ў топ-10 рэйтынга продажаў і заняла дзявятае месца. Усяго за першае паўгоддзе 2018 года было рэалізавана 810 аўтамабіляў маркі, што на 311 % больш, чым за той жа перыяд мінулага года. Нагадаем: планавалася, што ў 2018-м з канвеера «БелДжы» сыдуць 25 тысяч аўтамабіляў — каля 22 тысяч пойдзе на Расію, астатнія некалькі тысяч — на продаж у Беларусі.

Аўтамабіль, які куплялі найчасцей за гэты перыяд, — усё яшчэ Volkswagen Polo — 2194 машыны. Другое месца — LADA Vesta — была прададзена 1971 такая мадэль. Цікава, што з трэцяга па шостае месца — толькі Renault: Logan (1571 аўто), Sandero Stepway (1415), Duster (1241) і Kaptur (1018).

Упершыню ў рэйтынг увайшоў аўтамабіль беларускай зборкі: Geely Atlas і заняў дзявятае месца — дылеры рэалізавалі 746 аўто.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ**

■ Зорка — да нас

**Айчынныя аматары спорту доўга не маглі паверыць, што вялікі, непараўнальны, легендарны, адзін з найлепшых футбалістаў мінулага стагоддзя будзе датычны да беларускага футбола. Спачатку размовы аб тым, што Дыега Арманда Марадона стане часткай сістэмы брэсцкага «Дынама» лічыліся толькі чуткамі, а сам клуб пастаянна ўхіляўся ад адказаў на пытанні журналістаў на гэтую тэму. Пасля адстаўкі трэнера брастаўчан хтосьці пачаў меркаваць, што менавіта на трэнерскую пасаду можа быць запрошаны знакаміты аргенцінец, а крыху больш за два месяцы таму кіраўніцтва «Дынама» паведаміла, што Марадона стане старшынёй праўлення клуба.**



Фота БелТА.

# «КАЛІ Я СКОНЧУ СВАЮ КАР'ЕРУ Ў БРЭСЦЕ, ТО ЗАСТАНУСЯ ТУТ ЖЫЦЬ»

## Як легенда футбола пабываў у Беларусі

У разгар чэмпіянату свету па футболе ў Расіі, на якім Дыега падтрымліваў сваю зборную, прэс-служба брэсцкага клуба абвясціла, што Марадона прыедзе на матч «Дынама» супраць «Шахцёра» 16 ліпеня. Падзея па-сапраўднаму знакавая для горада, таму не дзіўна, што яна сабрала ў будны дзень мноства народу не толькі на стадыёне, але і каля гасцініцы, у якой прайшла прэс-канферэнцыя Марадоны. Прысутнічалі там, вядома, і журналісты, дарэчы, не толькі беларускія: пагутарыць з вялікім футбалістам прыехалі калегі з Расіі і нават Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў.

### Аб прапанове ад «Дынама»

Дыега прыляцеў у брэсцкі аэрапорт раніцай панядзелка на ўласным самалёце, выйшаўшы з яго, ён пацалаваў руку і прыклаў яе да беларускай зямлі.

— У першую чаргу хачу падзякаваць сваёй маме, якая ўжо на нябёсах. Яна накіроўвае мяне ва ўсіх учынках, — пачаў сваю гутарку Марадона на прэс-канферэнцыі. — Дзякуй «Дынама-Брэст» за тое, што зрабілі мне гэтую прапанову. Я ні секунды не сумняваўся, убачыўшы, што гэта сур'ёзны праект. Я рады быць тут. Калі скончу сваю кар'еру ў Брэсце, то застануся тут жыць. Цяпер мне неабходны невялікі адпачынак, таму што я паўтара года не быў у Аргенціне, не бачыў дзяцей і сясцёр, сваіх астатніх сваякоў. Пара зарадзіць батарэйку, каб вярнуцца сюды і зрабіць з «Дынама» каманду, якая зможа змагацца і радаваць усіх балельшчыкаў. Хачу зрабіць так, каб яны ганарыліся футбалістамі. Я ўжо пераадзеты, гатовы праводзіць першую трэніроўку, — з усмешкай заявіў Марадона. — Вядома, за адзін дзень каманду не пабудаваць, трэба час, каб яна магла ствараць канкурэнцыю, і потым мы пагаворым аб выніках.

### Пра Беларусь і мясцовы футбол

Марадона адзначыў, што змог бы застацца жыць у нашай краіне, нават нягледзячы на няўстойлівае і часам халоднае надвор'е.

Вядомы футбаліст сказаў, што ўжо знаёмы з многімі лідарамі дзяржаў і ў будучыні хацеў бы пазнаёміцца з прэзідэнтам Беларусі.

— У мяне вельмі вялікія ўспаміны пра Фідэля Кастра, Чавеса, Мадуру, Артэгу, Кадафі. Таксама я ведаю Пуціна і цяпер хачу зрабіць фатаграфію з Аляксандрам Лукашэнкам. Спадзяюся, ён стане нашым балельшчыкам.

Дыега запэўніў, што знаёмы з беларускім футболам і ведае не толькі той клуб, у якім будзе працаваць.

— Я паважаю ўсіх супернікаў, але не буду казаць пра БАТЭ ці іншыя клубы. Буду казаць толькі пра маё «Дынама». Як я ўжо адзначаў, мы пастараемся зрабіць каманду, якая будзе змагацца за найлепшыя месцы. Мы павінны быць мацнейшымі ментальна, а не толькі фізічна. Я хачу даць гульцам найлепшае са сваёй футбольнай кар'еры, падзяліцца вопытам.

Марадона не выключае, што дзеля работы ў «Дынама» ён нават вывучыць рускую мову.

— Вядома, я не пачну размаўляць на ёй так, як вы. Але на ўстаноўках гульцам буду выкарыстоўваць. Збіраюся паляпшаць свой слоўнікавы запас, каб размаўляць з футбалістамі хаця б часткова на адной мове. Думаю, на гэта ў мяне будзе час. Кантракт з «Дынама» — адна з найлепшых падзей у маім жыцці. Я думаю, што ў свае гады ўжо не змагу ўзняць каманду, аказалася, што магу, паспрабую, па меншай меры.

### Пра чэмпіянат свету ў Расіі

Адной з непазбежных тым на прэс-канферэнцыі стаў чэмпіянат свету ў Расіі. Дыега Марадона даў сваю разгорнутую ацэнку мундзіялю.

— Мы бачылі вельмі добры чэмпіянат, многія каманды здзівілі, многія гульцы добра сябе паказалі, напрыклад, Мбапэ, Азар. І наадварот, Неймар, Раналду, Месі, якія былі далёкія ад сваёй найлепшай гульні. Арганізацыя чэмпіянату была цудоўная, улічаны ўсе дэталі. Чуў, што былі людзі, якія хацелі нанесці шкоду мундзіялю, але Пуцін выдатна ўсё падрыхтаваў і зрабіў так, каб службы бяспекі працавалі выдатна і балельшчыкі без праблем маглі хадзіць на стадыёны, — адзначыў Марадона. — Калі казаць пра зборную Расіі, яна зрабіла больш, чым ад яе чакалі. Да мундзіялю магла прайграць любой камандзе, а зараз атрымалася выбіць былых чэмпіёнаў свету, зборную Іспаніі. Гульцы стараліся, выкладаліся па поўнай, у іх не было ні Неймара, ні Раналду, ні Азара, але яны справіліся. Іх перавага была ў тым, што яны беглі, беглі і беглі.

Калі я глядзеў фінал, казаў сабе: ужо не ты гуляеш, гуляюць іншыя футбалісты. Я нашмат больш забаўляўся з мячом, у параўнанні з тым, што адбываецца цяпер. Няма гульцоў, якія мяне здзіўляюць, няма гульцоў, якія забіваюць вялікія галы. Зрэшты, мы павінны забыць гэты чэмпіянат свету і прыглядацца да наступнага.

Пасля прэс-канферэнцыі Марадона адправіўся на стадыён, дзе з'явіўся ў касцюме з эмблемай «Дынама». Публіка сустракала легенду гучнымі авацыямі і крыкамі «Дыега!». Павітаўшыся з балельшчыкамі і футбалістамі, Марадона адправіўся на трыбуну, адкуль і глядзеў матч свайго клуба з салігорскім «Шахцёрам». (Брастаўчане, нягледзячы на зорную падтрымку, прайгралі. Можа, перахваляваліся?)

Адзначым, што на сустрэчы з Дыега Марадонам гаворка ішла таксама пра тое, што ў Брэсце хутка з'явіцца акадэмія футбола імя Марадоны і новы стадыён на 30 тысяч месцаў.

***Дырэктар па развіцці брэсцкага «Дынама» Віктар РАДЗЬКОЎ:***

— Вітаю ўсіх, хто мае дачыненне да брэсцкага «Дынама». У нас шмат планаў, якія мы збіраемся рэалізаваць разам з Дыега. Плануецца, што новы стадыён з'явіцца на Камянецкім кальцы, — гэта зручная аўтамабільная развязка. Канцэпцыя стадыёна будуецца вакол сям'і, якая павінна трапляць на тэрыторыю арэны з раніцы і праводзіць там увесь дзень да матча. На тэрыторыі новага стадыёна будзе вялікая колькасць фуд-кортаў, а таксама музей футбола Брэстчыны. Мы не баімся заяўленай змяшчальнасці ў 30 тысяч. Так, гэта даволі маштабна для Беларусі, але, улічваючы фактар нашага боса Дыега Марадоны, на якога могуць прыляцець паглядзець з усяго свету, пакаштуе цалкам нармальны. Там таксама будзе гандлёвы цэнтр, бізнес-цэнтр, гасцініца і акадэмія Марадоны. У яе будуць адбірацца найлепшыя гульцы, хлопцы, якія будуць выйграваць Лігу Еўропы і Лігу чэмпіёнаў. Мы нават замахнёмся на большае — чэмпіянаты свету і Еўропы.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

*г. Брэст*



■ Прыёмная кампанія — 2018

# Фізіка — у аўтсайдарах

## ... а на хвалі інтарэсу — спецыяльнасці ІТ-сферы

**Учора а 18-й гадзіне дзверы прыёмных камісій у вышэйшых навучальных установах зачыніліся. Сёлета, каб вызначыцца з месцам сваёй вучобы, у абітурыентаў, што прэтэндавалі на бюджэтную форму навучання, было шэсць дзён.**

Апошнія тры гадзіны да закрыцця прыёмных камісій традыцыйна самыя напружаныя: абітурыенты с невысокай сумай балаў ці з баламі, набліжанымі да прахадного, сумняваюцца і вагаюцца да апошняга. Некаторыя не вытрымліваюць нервовага напружання і забіраюць свае дакументы. Часам сумняваюцца ў сваіх шанцах пачынаюць нават абітурыенты з дастаткова высокімі баламі, і ў выніку на факультэт збіраюць тых, хто набраў значна меншую суму. Такая сітуацыя характэрная для тэхнічных ВНУ, дзе на большасці спецыяльнасцяў патрабуюць аднолькавы набор сертыфікатаў ЦТ.

Учора раніцай яшчэ шмат дзе колькасць пададзеных заяў была меншай за колькасць выдзеленых бюджэтных месцаў. Так у Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце на фізіка-матэматычным факультэце на спецыяльнасць «матэматыка і інфарматыка» было пададзена 58 заяў на 70 месцаў, а на спецыяльнасці «фізіка і інфарматыка» — 20 заяў на 50 месцаў. Сітуацыя з фізікай па-ранейшаму сумная.

У Беларускім дзяржаўным універсітэце не вельмі аптымістычная сітуацыя складвалася на механіка-матэматычным факультэце на спецыяльнасцях «механіка і матэматычнае мадэляванне» — 20 прэтэндэнтаў на 40 месцаў; матэматыка (кірунак «навукова-канструктарская дзейнасць») — 3 прэтэндэнты на 20 месцаў; матэматыка (навукова-педагагічная дзейнасць) — 13 прэтэндэнтаў на 25 месцаў і «матэматыка» (эканамічная дзейнасць) — 11 прэтэндэнтаў на 20 месцаў. Затое на спецыяльнасці «матэматыка і інфармацыйныя тэхналогіі» (кірунак — «вэб-праграмаванне і інтэрнэт-тэхналогіі») на 20 месцаў прэтэндавалі 54 чалавекі, на спецыяльнасці «матэматыка інфармацыйныя тэхналогіі» (матэматычнае і праграмнае забеспячэнне мабільных устройстваў) — на 20 месцаў падалі 28 заяў. Відавочна, што ІТ-сфера застаецца для моладзі найбольш прыцягальнай. Так, на факультэце прыкладной матэматыкі і інфарматыкі на спецыяльнасць «інфарматыка» на 95 месцаў было пададзена 150 заяў, «прыкладная інфарматыка» («праграмнае забеспячэнне камп'ютарных сістэм») — 60 заяў на 25 месцаў. І літаральна на вачах колькасць пададзеных дакументаў павялічвалася. Затое не моцна цікавілі моладзь «эканамічная кібернетыка» і «прыкладная матэматыка» (кірунак — «навукова-вытворчая дзейнасць).

На факультэце радыёфізікі і камп'ютарных тэхналогій таксама найбольшай папулярнасцю карыстаюцца «камп'ютарная бяспека» (кірунак — «радыёфізічныя сістэмы і праграмна-тэхнічныя сродкі») — 81 прэтэндэнт на 54 месцы і «прыкладная інфарматыка» («інфармацыйныя тэхналогіі тэлекамунікацыйных сістэм» — 57 ахвотных на 40 месцаў). У аўтсайдарах — спецыяльнасці «радыёфізіка», «фізічная электроніка» і «аэракасмічныя радыёэлектронныя і інфармацыйныя сістэмы і тэхналогіі».

Пры гэтым у БДУ на чатыры факультэты падалі дакументы абітурыенты з сумай балаў больш як 391, у тым ліку і ўладальніца 400 балаў — выпускніца пінскай гімназіі № 3 Настасся ЖАЎНЕРЫК (пра яе мы пісалі ў суботнім нумары). Увогуле на факультэце міжнародных адносін у 11 абітурыентаў сума балаў знаходзіцца ў дыяпазоне ад 391 да 400, таму менавіта гэты факультэт, хутчэй за ўсё, зноў паставіць рэкорд па прахадных балах у краіне.

Ёсць абітурыенты з сумай балаў больш як 391 таксама ў Беларускім дзяржаўным медыцынскім універсітэце, Мінскім дзяржаўным лінгвістычным універсітэце, у БДУІР...

З 18 ліпеня распачынаюцца ўступныя выпрабаванні, якія праводзяцца непасрэдна ва ўстановах адукацыі. Маюцца на ўвазе экзамены па творчасці, фізічнай культуры, а таксама экзамены для абітурыентаў, якія паступаюць на аснове сярэдняй спецыяльнай адукацыі на скарочаныя тэрміны навучання. Уступныя іспыты арганізаваны толькі ў адну сесію: як для асоб, што паступаюць за кошт сродкаў бюджэту, так і на платнай аснове.

Уступныя выпрабаванні пройдуць у наступныя тэрміны:

з 18 да 21 ліпеня — у Акадэміі МУС, Магілёўскім інстытуце МУС, Універсітэце грамадзянскай абароны МНС;

з 18 да 26 ліпеня — у Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў;

з 18 да 24 ліпеня — у іншых ВНУ.

з 18 да 25 ліпеня ў ВНУ сельскагаспадарчага профілю пры паступленні на дзённую форму навучання.

Тэрміны залічэння на «бюджэт» наступныя: да 24 ліпеня — у ВНУ сілавых ведамстваў, да 28 ліпеня — у творчых, сельскагаспадарчых і іншых ВНУ.

Прыём дакументаў на вакантныя бюджэтныя месцы ў рамках дадатковага набору будзе весціся ў ВНУ сілавых ведамстваў з 26 да 28 ліпеня (залічэнне да 30 ліпеня), у творчых ВНУ — з 30 да 31 ліпеня (залічэнне да 1 жніўня) і ў іншых ВНУ — з 30 ліпеня да 1 жніўня (залічэнне да 3 жніўня).

Тэрміны залічэння на платную форму навучання ў ВНУ сілавых ведамстваў — да 2 жніўня, у творчых ВНУ — да 3 жніўня, у іншых ВНУ (акрамя завочнай формы навучання ў сельскагаспадарчых ВНУ) — да 6 жніўня.

**Надзея НІКАЛАЕВА**

МОСКВА МИНСК БАНК

## Открытое акционерное общество «Банк Москва–Минск»

220002, г. Минск, ул. Коммунистическая, д. 49, пом. 1

### БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС НА 1 ИЮЛЯ 2018 г.

*(в тысячах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 01.07.2018 | 01.01.2018 |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | АКТИВЫ | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | | 36 764 | 47 638 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | | 117 882 | 81 906 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | | 106 018 | 56 812 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | | 123 500 | 138 845 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | | 620 069 | 522 923 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | | 6 | 158 |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | | 176 | 17 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | | 43 279 | 44 418 |
| 11 | Доходные вложения в материальные активы | 1110 | | 1 012 | - |
| 12 | Имущество, предназначенное для продажи | 1111 | | 631 | 40 |
| 13 | Отложенные налоговые активы | 1112 | | - | - |
| 14 | Прочие активы | 1113 | | 11 505 | 9 006 |
| 15 | ИТОГО активы | 11 | | 1 060 842 | 901 763 |
| 16 | ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | | | | |
| 17 | Средства Национального банка | 1201 | | 16 260 | - |
| 18 | Средства банков | 1202 | | 85 466 | 30 573 |
| 19 | Средства клиентов | 1203 | | 809 687 | 753 065 |
| 20 | Ценные бумаги банка | 1204 | | 24 053 | 3 097 |
| 21 | Производные финансовые обязательства | 1205 | | 5 | - |
| 22 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | | - | - |
| 23 | Прочие обязательства | 1207 | | 9 444 | 9 290 |
| 24 | ВСЕГО обязательства | 120 | | 944 915 | 796 025 |
| 25 | СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ | | | | |
| 26 | Уставный фонд | 1211 | | 16 382 | 7 568 |
| 27 | Эмиссионный доход | 1212 | | - | - |
| 28 | Резервный фонд | 1213 | | 10 250 | 8 850 |
| 29 | Фонд переоценки статей баланса | 1214 | | 27 465 | 27 429 |
| 30 | Накопленная прибыль | 1215 | | 61 830 | 61 891 |
| 31 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | | 115 927 | 105 738 |
| 32 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | | 1 060 842 | 901 763 |

### ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ НА 1 ИЮЛЯ 2018 г.

*(в тысячах белорусских рублей)*

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 01.07.2018 | 01.07.2017 |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | | 35 709 | 38 599 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | | 19 999 | 19 612 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | | 15 710 | 18 987 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | | 16 963 | 8 023 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | | 6 277 | 3 011 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | | 10 686 | 5 012 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | | (62) | (119) |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | | 9 567 | 8 407 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | | 216 | 675 |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | | (3 507) | 7 924 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | | 769 | 1 486 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | | 19 444 | 17 762 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | | 3 522 | 1 627 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | | 17 427 | 7 135 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | | 4 182 | 1 653 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | | 13 245 | 5 482 |

**Председатель Правления** **И.В. Лихогруд**

**Главный бухгалтер** **А.В. Дорожкин**

Квартальная индивидуальная бухгалтерская (финансовая) отчетность размещена на следующей странице интернет-сайта банка: http://www.mmbank.by/about/finance/

Лицензия НБ РБ № 16 от 17.03.2015, УНП 807000002

## Управление принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома объявляет о проведении торгов по продаже имущества, принадлежащего СРДУП «Выдрея» ТРУП «Витебское отделение железной дороги» (УНП 391101923)

| | |
|---|---|
| Наименование (описание) имущества и его стоимость | Лот № 1. Капитальное строение – здание специализированное автомобильного транспорта, наименование – гараж общей площадью 48,5 кв. м, инв. №202/С-55469 с начальной ценой 880,00 рублей; |
| Наличие обременений | Отсутствуют |
| Местонахождение имущества | Витебская область, Лиозненский район, д. Новое Село |
| Место, дата и время проведения торгов | 07.08.2018 г. в 10.00, г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1, каб. 2.6 |
| Справочная информация об организаторе торгов | Управление принудительного исполнения ГУЮ Витоблисполкома (г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1 www.vitebskjust.gov.by).<br>Заместитель начальника отдела принудительного исполнения управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома – Рязяпов Никита Фанилевич, тел./факс. (80212) 614012, (8033) 6879170 |
| Условия и порядок проведения торгов | Лицо, желающее принять участие в торгах, до начала торгов обязано:<br>1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством.<br>2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет управления принудительного исполнения ГУЮ Витоблисполкома IBAN BY73AKBB36429030010372000000 в ф-ле 200 ОАО «АСБ Беларусбанк», BIC AKBBBY21200, УНП 300002505, не позднее 15.00 06.08.2018 г.<br>Величина первого шага составляет 5 процентов от начальной стоимости выставленного на торги имущества (лота).<br>В соответствии со статьей 97 Закона Республики Беларусь «Об исполнительном производстве» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги (покупателем) |

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**ЛОТ 1:**

– капитальное строение, инв. № 422/С-42213 (назначение – здание специализированное здравоохранения и предоставления социальных услуг, наименование – здание лечебного корпуса (больница)) площадью 405,6 кв. м, расположенное по адресу: Щучинский р-н, Остринский с/с, д. Берестовица, ул. Центральная, 26А;

– капитальное строение, инв. № 422/С-12977 (назначение – здание специализированное здравоохранения и предоставления социальных услуг, наименование – амбулатория) площадью 86,4 кв. м, расположенное по адресу Щучинский р-н, Остринский с/с, д. Бершты, ул. Центральная, 27А;

– капитальное строение, инв. № 422/С-12974 (назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – овощехранилище) площадью 8,2 кв. м, расположенное по адресу: Щучинский р-н, Остринский с/с, д. Берестовица, ул. Центральная, 26А, корп. 1;

– капитальное строение, инв. № 422/С-12975 (назначение – здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в т. ч. автомобильные заправочные и газонаполнительные станции), наименование – гараж), площадью 53,3 кв. м, расположенное по адресу Щучинский р-н, Остринский с/с, д. Берестовица, ул. Центральная, 26А, корп. 2;

– капитальное строение, инв. № 422/С-12976 (назначение – здание специализированное здравоохранения и предоставления социальных услуг, наименование – хозяйственный корпус) площадью 207,9 кв. м, расположенное по адресу: Щучинский р-н, Остринский с/с, д. Берестовица, ул. Центральная, 26А, корп. 3

Лот № 1 расположен на земельных участках:

– кадастровый номер 425884800405000035, площадью 0,3270 га (назначение – для обслуживания зданий и зданий больницы) по адресу: Щучинский р-н, Остринский с/с, д. Берестовица, ул. Центральная, 26А. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земельный участок, расположенный в охранной зоне линий электропередачи, код – 13,2, площадью 0,0365 га; земли, находящиеся в водоохранных зонах водных объектов вне прибрежных полос, код – 2, площадью 0,3270 га;

– кадастровый номер 425884800405000034, площадью 0,0433 га (назначение – для эксплуатации и обслуживания здания амбулатории) по адресу: Щучинский р-н, Остринский с/с, д. Бершты, ул. Центральная, 27А. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земли, находящиеся в водоохранных зонах водных объектов вне прибрежных полос, код – 2, площадью 0,0433 га

Начальная цена продажи – 14 718 р. (четырнадцать тысяч семьсот восемнадцать рублей) с учетом НДС

Сумма задатка – 736 руб. (семьсот тридцать шесть рублей)

Продавец – Щучинский филиал Гродненского областного потребительского общества, 231513, г. Щучин, ул. Пушкина, 26, тел. (801514) 28-1-50

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 45-05-38

Условия аукциона – аукцион без условий. Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 5 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка – BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 1 августа 2018 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Щучин, ул. Пушкина,26**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами: заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка; *физическим лицом* – паспорт (документ его заменяющий) и его копия; *юридическим лицом и ИП – резидентами Республики Беларусь* – заверенные копии учредительных документов; *юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе представителем организатору аукциона предъявляется документ, подтверждающий полномочия представителя, и документ, удостоверяющий его личность. Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона. Продавец имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным.

В процессе торгов начальная цена повышается в соответствии с шагом аукциона аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Срок возмещения затрат на организацию и проведение аукциона – 3 рабочих дня.

**Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 14.04.2018 г.**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Последний день приема заявлений – 26 июля 2018 г. до 15.00**

*Телефоны для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» http://grodnoino.by*

| | |
|---|---|
| Дата, время и место проведения аукциона | 21 августа 2018 года в 10.00 в здании Сорочинского сельисполкома д. Сорочино |
| Место, дата и время начало и окончания приема заявлений, прилагаемых документов | Заявления принимаются с 20 июля 2018 года до 17 августа 2018 года включительно с 8.00 до 17.00 в рабочие дни в здании Сорочинского сельского исполнительного комитета по адресу: Витебская область, Ушачский район, д. Сорочино. Граждане представляют паспорт гражданина РБ, его ксерокопию и квитанцию об уплате задатка.<br>Телефоны: 5-27-92, 5-39-31, (8 029) 183-08-66, (8033) 3242526 |
| Наименование объекта | Земельный участок |
| Целевое назначение | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома |
| Место расположения | Витебская область, Ушачский район, д. Белое, 13А |
| Характеристика земельного участка | Расположен в прибрежной полосе озера Троща |
| Кадастровый номер | 224986000901000080 |
| Площадь земельного участка (га) | 0,2498 га |
| Порядок осмотра на местности земельного участка, выставляемого на аукцион | Осмотр земельного участка будет производиться по обращению граждан в комиссию по проведению аукционов |
| Начальная цена, руб. | 2 500,00 рублей |
| Размер задатка, руб. | 250,00 рублей, уплачивается при подаче заявления на регистрацию участника аукциона. Получатель: Сорочинский сельский исполнительный комитет, р/с BY43AKBB36043280609232300000, ф-л 216 ОАО «АСБ «Беларусбанк», БИК банка AKBBBY21216, г. Полоцк, УНП 300007045, код платежа – 04901 |
| Условия продажи объекта | Внесение победителем аукциона платы за земельный участок, возмещение расходов, связанных с изготовлением документации и его проведением, – 1915,82 рубля + затраты за опубликование объявления |

Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

**Извещение о проведении аукциона**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ОАО «СПЕЦРЕМОНТ», 220036, г. Минск, Бетонный проезд, 13, тел./факс 8017-213-62-05 |

**Предмет аукциона**

| Наименование (назначение) | Инв. номер | Общ. пл. | Адрес |
|---|---|---|---|
| **Здание склада** (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ) | 500/С-64982 | 24 кв. м | г. Минск, ул. Инженерная, 17/1 |

Сведения о земельном участке: предоставлен продавцу на праве постоянного пользования общ. пл. 0,4242 га для эксплуатации и обслуживания зданий и сооружений материально-комплектовочной базы.

Ограничения (обременения): земли, находящиеся в водоохранных зонах водных объектов вне прибрежных полос пл. 0,4242 га

**Начальная цена с НДС 20 %: 289 200,00 белорусских рублей BYN**
**Шаг аукциона: 14 460,00 белорусских рублей BYN**

**Порядок ознакомления:** осуществляется в рабочие дни с 8.00 до 17.00, перерыв с 12.00 до 13.00. Ответственное лицо: Мойсеенко Владимир Владимирович, главный инженер, тел. 8 029 613-62-05

**С подробной информацией по предмету аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона www.cpo.by**

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10** (десять) рабочих дней после проведения аукциона

**Срок оплаты:** не более 30 (тридцати) дней со дня заключения договора купли-продажи

**Порядок оформления участия в аукционе и результатов торгов:** аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совмина РБ от 8 января 2013 г. № 16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица». К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, зарегистрированное в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов договор о задатке. С подробной информацией о перечне предоставляемых документов, образцами заявления на участие в аукционе и договора о задатке, а также правилами проведения аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона www.cpo.by

В случае признания торгов несостоявшимися в связи с тем, что заявление на участие в них было подано только одним участником либо для участия в них явился только один участник, возможна продажа предмета торгов этому участнику по начальной цене, увеличенной на 5 %

**Затраты** на организацию и проведение торгов возмещаются организатору аукциона участником торгов, с которым заключается договор купли-продажи в течение 5 дней со дня проведения торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

| | |
|---|---|
| **Дата, место и время проведения аукциона** | **21.08.2018** в 11.00 по адресу**: г. Минск, Бетонный проезд, 17, ОАО «СПЕЦРЕМОНТ»** |
| **Дата, место и время окончания приема документов** | **17.08.2018** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** |
| **Контактные телефоны** | **+375 17 280-36-37; +375 29 317-95-42. Email: auction@cpo.by** |

## УП «Белконфискат»

**обьявляет о проведении электронных торгов 10.08.2018 г. по продаже имущества, зарегистрированного за Шилик Н. Н.**

Легковой универсал «MAZDA 626», МКПП, 1989 г. в., бензин, начальной стоимостью 600 рублей. На сайте Belkonfiskat.by размещена информация о лоте, порядке проведения торгов и участия в них. Справки по тел.: 8 (017) 2269489, 8 (029) 7790809.

УНН 190431606

## Извещение о проведении аукциона по продаже земельных участков в частную собственность

**Организатор:** государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, дом 5, тел. (0212) 47-20-56.

| Кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение земельного участка |
|---|
| Лот № 1. Земельный участок с кадастровым № 221287005101000116, площадью 0,1178 га по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Новкинский с/с, д. Городняны для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: водоохранная зона рек и водоемов (оз. Городно). **Нач. цена**: 3 000 бел. руб. **Задаток:** 300 бел. руб. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с BY85AKBB36003141001190000000 ОАО «АСБ «Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УНП 300594330, код платежа 04901, получатель платежа: ГУ МФ РБ по Витебской области (Новкинский сельсовет) |
| Лот № 2. Земельный участок с кадастровым № 221280610601000197, площадью 0,1452 га по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Бабиничский с/с, д. Подберезье, ул. Новоселов, 6, для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: нет. **Нач. цена**: 5 000 бел. руб. **Задаток:** 500 бел. руб. **Реквизиты для внесения задатка**: р/с BY23AKBB36003140100360000000 ОАО «АСБ «Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УНП 300594330, код платежа 04901, получатель платежа: ГУ МФ РБ по Витебской области (Бабиничский сельсовет) |
| **Дата, время и место проведения аукциона:** 24.08.2018 в 15.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Срок внесения задатка и приема документов:** с 18.07.2018 с 8.30 по 23.08.2018 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» в рабочие дни с 8.30 до 17.30. Для участия в аукционе приглашаются граждане Республики Беларусь, консолидированные участники (двое и более граждан Республики Беларусь) |

Аукционы проводятся в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462. Для участия в аукционе приглашаются граждане РБ, консолидированные участники (двое и более граждан РБ). Для участия в аукционе граждане РБ подают заявление об участии в аукционе, представляют документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка, заключают с организатором аукциона соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Представляются: гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность; консолидированными участниками – оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе. При подаче документов на участие в аукционе граждане предъявляют паспорт гражданина РБ, представители граждан, уполномоченные лица (представители) – документ, удостоверяющий личность, и доверенности, выданные в установленном законодательством порядке. **Условия аукциона: победитель аукциона, единственный участник несостоявшегося аукциона обязан:** в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за зем. участок и возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения; в двухмесячный срок со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся обратиться в РУП «Витебское агентство по гос. регистрации и зем. кадастру» за гос. регистрацией прав, ограничений (обременений) прав на зем. участок; получить в установленном порядке разрешение Витебского райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработать проект на строительство объекта в срок, не превышающий двух лет; в течение 1 года со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство объекта приступить к занятию зем. участка в соответствии с целью и условиями его предоставления; осуществить строительство объекта в сроки, определенные ПСД; снять, сохранить и использовать плодородный слой почвы согласно ПСД. Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории устанавливаются проектной документацией. Назначение зем. участков в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества: 1 09 02 – зем. участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по гос. регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме). Аукцион состоится при наличии не менее 2 участников. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Всем участникам предоставляется право ознакомления с земельно-кадастровой документацией, а также возможность осмотра на местности зем. участка. Конт. тел.: (0212) 47-20-56, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru; www.marketvit.by

# РЫХТУЕМ БОЧКІ ЛЕТАМ...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Цяпер гэты «недахоп» выпраўлены: днямі ў рэдакцыі «Звязды» адбыўся чарговы розыгрыш: з лёгкай рукі адданых падпісчыкаў газеты (і, дарэчы, вельмі прыгожых людзей!) мінчан **Людмілы Яўгенаўны Сідарэвіч, Сцяпана Пятровіча Ляшчэнкі і інжынера ўпраўлення друкаваных СМІ РУП «Белпошта» Таццяны Іванаўны Усевіч** (на здымку) — бочкі знайшлі гаспадароў. Такім чынам

БОЧКУ ДУБОВУЮ НА ДЗЕСЯЦЬ ЛІТРАЎ ВЫЙГРАЛІ:

**Уладзімір Іванавіч Сямашка, г. Брэст;**
**Марына Фёдараўна Быкава, г. Віцебск;**
**Святлана Міхайлаўна Краўцова, в. Высокае Рагачоўскага раёна Гомельскай вобласці;**
**Наталля Барысаўна Копач, в. Міхайлоўшчына Ашмянскага раёна Гродзенскай вобласці;**
**Іосіф Браніслававіч Паўкалас, в. Навасёлкі Маладзечанскага раёна Мінскай вобласці;**
**Валерый Мікалаевіч Гаўрыш, г. Чавусы Магілёўскай вобласці;**
**Ала Міхайлаўна Ракевіч, г. Мінск.**

СУПЕРПРЫЗ — БОЧКУ ДУБОВУЮ НА ТРЫЦЦАЦЬ ЛІТРАЎ ВЫЙГРАЛА

**Святлана Мікалаеўна Герасімчук з в. Даколь Глускага раёна Магілёўскай вобласці.**

Віншуем тых, каму пашчасціла! Каму не, — чарговы раз скажам суцяшальнае: вы не выйгралі, але ж і не прайгралі: страцілі хіба канверт ды... надзею (у прыватнасці, на бочку). Але ж яна, як той казаў, не памірае: не за гарамі новая падпісная кампанія — з новай рэкламнай гульнёй і новымі не менш цікавымі прызамі, адзін з якіх — што цалкам магчыма — выйграеце вы! А таму заставайцеся са «Звяздой»: выпісвайце, чытайце, дасылайце карткі на розыгрыш. Вам пашанцуе, як, напрыклад, той жа Святлане Мікалаеўне Герасімчук, чый суперпрыз ужо ў дарозе да сваёй атрымальніцы.

**Афіцыйна**

Арганізатарам рэкламнай гульні «Звязда» — руплівым гаспадарам!» з'яўляецца рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда» (УНП 100155376), размешчаная па адрасе: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 А.

Рэкламная гульня «Рыхтуй бочкі летам са «Звяздой» зарэгістравана Міністэрствам гандлю Рэспублікі Беларусь 25.05.2018 г. (пасведчанне № 3284) і праводзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь з 1 чэрвеня да 30 верасня 2018 года ўключна сярод падпісчыкаў газеты «Звязда» на трэці квартал або другое паўгоддзе 2018 года. Усяго ў гульні ўзялі ўдзел 144 падпісчыкі. Прызавы фонд гульні разыграны цалкам.

Тэлефон для даведак па пытаннях правядзення рэкламнай гульні і атрымання прызоў: 8 (017) 263 66 73.

■ Людзі і лёсы

# «НЕЛЬГА АПУСКАЦЬ РУКІ...»

**Некалькі гадоў таму Эдуарду Лаўрэнюку здавалася, што жыццё страціла ўсякі сэнс. Сур'ёзная страта здароўя была для яго як прысуд: не збыцца, значыць, ні планам, ні марам...**

На шчасце, побач з ім былі жонка і сын, работнікі Маларыцкага тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання...

— Днямі сядзець каля тэлевізара ці камп'ютара надакучвае, — прызнаецца Эдуард. — Прыйшлося распрацаваць своеасаблівую стратэгію далучэння сябе да здаровага і актыўнага ладу жыцця. Спачатку яно цяжкавата давалася, гублялася шмат і фізічных, і душэўных сіл. Але адступаць я не стаў.

Новы віток пачаўся ў Эдуарда з лагера актыўнай рэабілітацыі ГА «Рэспубліканская асацыяцыя інвалідаў-калясачнікаў», куды паехаў па прапанове спецыялістаў аддзялення дзённага знаходжання для інвалідаў і грамадзян пажылога ўзросту. Некалькі дзён, праведзеных на выездзе, сталі не проста памятнымі, яны, можна




Эдуард ЛАЎРЭНЮК падчас сустрэчы.

сказаць, перавярнулі жыццё. З лагера Эдуард вярнуўся іншым чалавекам, гатовым да новых перамог — у тым ліку спартыўных. Летась у складзе каманды Брэсцкай вобласці ён удзельнічаў у адкрытай рэспубліканскай спартакіядзе інвалідаў-калясачнікаў «Залатое кола», заваяваў першынство ў армрэслінгу, стаў трэцім у дваябор'і на калясцы...

У сям'і Эдуарда Лаўрэнюка новая кватэра, ён сам водзіць аўтамабіль, працуе сакратаром у Мельніцкай базавай школе.

— Жыццё нельга марнаваць, — лічыць мужчына, — не для гэтага яно даецца. Трэба радавацца кожнаму новаму дню і рухацца наперад, хай маленькімі крокамі, трэба наперакор абставінам гаварыць: «Я гэта змог!» Нельга апускаць рукі, як бы жыццё ні склалася...

Надоечы Эдуард Лаўрэнюк расказваў пра гэта маладым людзям з асаблівасцямі здароўя падчас сустрэчы ў аддзяленні дзённага знаходжання для інвалідаў і грамадзян пажылога ўзросту і слухалі яго з вялікай цікавасцю.

**Мікалай НАВУМЧЫК.**

■ Так ці не? Практыкум

# УБІРАЮЦЦА ЗВЫЧАЙНА ЖАНЧЫНЫ... І НЕ Ў ПАКОЯХ

**Гэтым разам у пошце рубрыкі простыя пытанні — прынамсі, на першы погляд: ці можна «ўбіраць пакоі», падарожнічаць «у доме на калёсах» і замест прывычнага слова «спачатку» пісаць і казаць, напрыклад, «па першым часе»?**

*Як заўжды, на моўныя пытанні чытачоў адказваюць стыльрэдактары «Звязды» Алесь Саламевіч і Леў Глушыцкі.*

1. Першае значэнне слова **ўбраць** — «сабраць ураджай». Тых жа сельскагаспадарчых культур, напрыклад. У другім — гэты дзеяслоў можа быць сінонімам слова **ўпрыгожыць**. *«А самае Азярко Дзед убраў прыгожаю вадзяною лотаццю, засеяў пахучым аерам і развёў цэлыя нівы чаротаў»*, — чытаем у Якуба Коласа.

Таму калі пакой (пакоі) і можна ўбраць, то толькі нечым прыгожым, напрыклад кветкамі або гірляндамі. А вось калі гаворка пра тое, каб зрабіць яго чыстым, то трэба ўжываць слова **прыбраць**.

Не варта забываць, што дзеясловы ўбрацца, убірацца ў нашай мове таксама звязаны з навядзеннем чысціні. Убіраюцца звычайна ў прыгожае адзенне: дзяўчаты і жанчыны — у сукенкі, хлопцы і мужчыны — у гарнітуры.

2. *Дом на калёсах* (калі гаворка пра аўтамабіль, у якім можна падарожнічаць, жыць) — адназначна грубая памылка. **Калёсы** (слова выкарыстоўваецца толькі ў множным ліку) — гэта па-беларуску павозка, у якую запрэжаны коні. А множны лік слова **кола — колы**. Таму правільна казаць і пісаць — **дом на колах**.

3. Сінонімаў у слова *«спачатку»* шмат: *перш, найперш, спярша, перш-наперш, адразу, у першую чаргу, перад гэтым, перад усім,* **на** *першым часе*... У артыкуле «Сінтаксіс адкрыты і схаваны» вядомы мовазнавец Алесь Каўрус слушна заўважаў, што прыназоўнік **па** ў падобных канструкцыях трэба пазбягаць. А вось прыклады выкарыстання выразаў **на першым часе, на першых часах:** *Але бэз у гэтую вясну на першым часе не хваліваў мяне і не радаваў зусім* (Іван Навуменка). *Адтуль на першых часах яна таксама пісала да Парулі, але не часта...* (Цішка Гартны).

Выраз *на першым часе* ёсць і ў даведніках. Напрыклад, яго як адзін з варыянтаў перакладу рускага *первое время* падае акадэмічны «Руска-беларускі слоўнік».

**У абарону слоў**

Напамінак, напамін, напамінаць, памінаць, успамін — усё гэта сваякі нашага слова **ўспамінаць**. Ужываецца яно і ў выразах *памянуць (успомніць) добрым словам, памянеш (папомніш, успомніш) маё слова*. Выкарыстоўвалі яго, вядома ж, і нашы класікі. Дык ці трэба шукаць яму замену?

Сёння распаўсюджаным варыянтам яе выступае слова ўзгадваць. Аднак перасцеражом ад яго ўжывання, бо такога слова, як неадноўчы ўжо пісалі ў сродках масавай інфармацыі, у нарматыўнай мове няма ўвогуле. Ёсць **згадваць** і **прыгадваць**. Але і іх трэба ўжываць на сваім месцы. Як і ўспамінаць — на сваім

■ Свой погляд

# ПАЖАРАЎ ПА ВІНЕ ЭЛЕКТРАПРАВОДКІ БЫЦЬ НЕ МОЖА... Але яны ёсць

**Амаль штодня сродкі масавай інфармацыі даносяць трагічныя весткі: то тут, то там адбываюцца ўзгаранні, пажары, часам — з чалавечымі ахвярамі.**
**Мяне — як спецыяліста ў галіне электразабеспячэння — найбольш непакоіць, што гэтыя трагедыі (успомнім жудасную ў расійскім Кемераве, дзе загінула 64 чалавекі, з іх — 41 дзіця!) адбываюцца па віне электраправодкі, чаго ў прынцыпе быць не павінна!**
**Нехта скажа: не павінна, але ж ёсць.**

Тады — заканамернае пытанне: чаму?

На мой погляд, прычына відавочная: стан электраправодкі, здольнасць выконваць «ускладзеныя» на яе функцыі ніхто і ніколі не правярае. Папросту кажучы, яе зрабілі (добра, калі сумленна і якасна) ды забыліся, прычым начыста.

Тут вось што кідаецца ў вочы: і машына, і жылы дом, напрыклад, з'яўляюцца прыватнай уласнасцю чалавека. Аднак без штогадовага тэхнічнага агляду, без вогнетушыцеля ды аптэчкі на аўтамабілі наўрад ці доўга паездзіш: цябе хутка спыняць і аштрафуюць. Што датычыцца дамоў — нават старых, драўляных, то туды могуць наведвацца газавікі (да нас, напрыклад, заходзілі не так даўно, загадалі замяніць кран, шланг і паставіць лічыльнік)... Могуць завітаць і пажарнікі — праверыць печы, дымаходы, пакінуць свае прадпісанні. І паспрабуй іх не выканай... А вось стан электраправодкі не цікавіць нікога.

Зноў жа заканамернае пытанне, чаму? Яна што — не ўяўляе ніякай небяспекі для маёмасці людзей, для іх здароўя і нават жыцця? Але ж факты сведчаць аб зусім адваротным.

...Сёння падача (увод) электраэнергіі ў кожнае памяшканне: кватэру, дом, офіс, гандлёвы цэнтр і г. д. у абавязковым парадку вядзецца праз ахоўныя прыстасаванні: тыя ж пробкі з калібраванымі (!) на адпаведны ток плаўкімі ўстаўкамі, аўтаматычныя пробкі альбо аўтаматычныя выключальнікі (таксама на адпаведны ток)... Калі ўсё гэта знаходзіцца ў рабочым стане, то пры любых пашкоджаннях праводкі ўзгарання не адбудзецца: ахова спрацуе раней, ток не дасягне небяспечнай велічыні — электраэнергія адключыцца.

Гэта ж — прычым імгненна, але, паўтаруся, пры наяўнасці спраўнага ахоўнага абсталявання — адбудзецца і ў выпадку кароткага замыкання, пры якім узнікае вялікі ток, правады пачынаюць перагравацца, іскрыць...

На нашых электрастанцыях, падстанцыях, прамысловых і іншых прадпрыемствах дзейнічаюць спецыяльныя правілы: падрабязна распісана перыядычнасць і аб'ём прафілактычных і ўзнаўляльных работ (рамонтаў), кваліфікацыя абслугоўвага персаналу. Усе гэтыя правілы безагаворачна выконваюцца, бо інакш, відаць, узнік бы поўны калапс — не гарэла б ніводная лямпачка.

Гэта — што датычыцца вытворцаў і буйных спажыўцоў электраэнергіі. Тэхнічнае абслугоўванне ахоўнага абсталявання на дробных — перыядычна і, што важна, кваліфікавана маглі б праводзіць, па-першае, прадпрыемствы раённых электрасетак (цяпер зона іх абслугоўвання абмяжоўваецца электрашчыткамі), па-другое, энергазбыт, які вядзе пакуль толькі ўлік скарыстанай электраэнергіі ды мяняе лічыльнікі адзін раз на чатыры гады, па-трэцяе, персанал ЖКГ, які да электраправодкі сёння не мае амаль ніякіх адносін, па-чацвёртае — самі карыстальнікі.

Які з варыянтаў найлепшы? Гэта, здаецца, відавочна: першыя два і хоць бы таму, што работнікі гэтых прадпрыемстваў маюць, на мой погляд, самае галоўнае — кваліфікаваных спецыялістаў, якія могуць сачыць за станам электраправодкі і несці потым адказнасць, бо пакуль яна цалкам ускладзена на... спажыўца электраэнергіі.

Карацей, варыянты вырашэння праблемы ёсць. Можна і трэба выбраць найлепшы, бо калі не выбіраць і нічога не мяняць, калі пакінуць усё як ёсць, то колькасць трагічных навін — аб новых пажарах з-за няспраўнай электраправодкі ды новых ахвярах, баюся, не зменшыцца, а наадварот — з гадамі будзе толькі расці.

**Яўген КАВАЛЬЧУК,**
**ветэран працы і энергетыкі, вынаходнік,**
*г. Мінск.*

# СМІ І КУЛЬТУРНЫЯ КАШТОЎНАСЦІ: КРОПКІ НАД «І»

**На «Славянскім базары» абмеркавалі стан сучаснай культуры і мастацтва славянскіх краін. Удзел у круглым стале «Культура і мастацтва як крыніца развіцця духоўна-маральных каштоўнасцяў. Роля СМІ ў фарміраванні агульнай культурнай прасторы славянскіх народаў», які зладзілі Міністэрства інфармацыі, Міністэрства культуры Беларусі і РВУ «Выдавецкі дом «Звязда», узялі прадстаўнікі органаў дзяржаўнага кіравання, рэспубліканскіх і рэгіянальных СМІ, дзеячы культуры і мастацтва.**



Fest-sby.by

Уздымаць прафесійным колам у межах фэсту надзённыя пытанні культурнай галіны, даваць на іх адказы, прапаноўваць ідэі аб супрацоўніцтве — гэта ўжо традыцыя. Сёлета на першы план выйшла тэма культурнай разнастайнасці і адзінства славян: што робіць у гэтым кірунку дзеячы культуры і якое адлюстраванне атрымліваюць у газетных публікацыях і на інтэрнэт-прасторы, у тэле- і радыёэфіры?

— Апошнім часам на тэрыторыі ўсходнеславянскіх дзяржаў чамусьці не вельмі модна стала гаварыць пра тое адзінства, якое ў нас калісьці было, пра нашы агульныя карані, гэта тэма чамусьці гучыць не так заўважна, як павінна. Але ў нас найбагацейшая агульная культура, а таму ёсць што захоўваць і развіваць і пра што гаварыць, — адзначыў **першы намеснік міністра інфармацыі Павел ЛЁГКІ.**

**Народны артыст Беларусі Анатоль ЯРМОЛЕНКА** падкрэсліў, што лічыць вельмі важным захаваць атмасферу ўзаемаразумення, душэўнай цеплыні і блізкасці, якія былі закладзены на «Славянскім базары» ад пачатку яго існавання. «Для творчага чалавека тое, што адбываецца на фестывалі, і складае сэнс жыцця. Для гэтага мы ўсе сюды прыязджаем — прадставіць гледачу новыя праекты, новыя і найлепшыя песні», — дадаў Анатоль Ярмоленка.

«Я на фестывалі ўпершыню, — прызналася **расійскі рэжысёр і прадзюсар Ліна АРЫФУЛІНА**, дзякуючы якой убачылі свет вядомыя тэлепраекты «Фабрыка зорак», «На ўвесь голас» і шэраг іншых. — Шчыра скажу, што аб гэтым шкадую, бо разумею, колькі часу і магчымасцяў упушчана. Але я ўжо адчула дух фестывалю, у якім няма пафасу, і перад жывым гукам усе роўныя, убачыла бездакорную арганізацыю на ўсіх узроўнях, і бачу магчымасці для супрацоўніцтва». «Фестываль стаў брэндам, мультыкультурным праектам, які аб'ядноўвае розныя народы. І ў гэтым яго значэнне і адметнасць. Бо патрыятызм, любоў да Радзімы — з'ява выдатная, а вось замыканне ў сваёй невялікай культурнай прасторы, адмежаванне ад навакольнага свету — негатыўная сучасная тэндэнцыя, якую трэба пераадольваць, у тым ліку і нам, журналістам», — падзяліўся меркаваннем **дырэктар прадстаўніцтва МДТРК «Мір» у Беларусі Уладзімір ПЯРЦОЎ.**

**Старшыня Міжнароднага фестывалю вакалу і музыкі для моладзі «Riga Symphony» Алена ШВІЛПЕ** (Латвія) зазначыла: «Ваш фестываль — унікальная з'ява, аналагаў якой у Еўропе я не ведаю, уражальны творчы кангламерат, у якім усё гучыць, сачыняецца і паказваецца на шматлікіх выставах. Я настолькі «загарэлася» ўбачаным, што ўжо двойчы праводзіла нацыянальны адбор на конкурс маладых выканаўцаў, а налета планую агульны прыбалтыйскі адбор для Літвы, Латвіі і Эстоніі».

**Выканаўчы віцэ-прэзідэнт Сусветнай Асацыяцыі фестываляў (WAF), дырэктар фэстаў «Ezerski Biseri» і «Asterisks» у Македоніі Мар'ян КАТАРОСКІ** звярнуў увагу на нарастаючую праблему сучаснага фестывальнага руху: «Сёння такія мерапрыемствы часта ладзіцца, прабачце, і жук, і жаба, і якасць далёка не заўжды адпавядае заяўленаму ўзроўню. Таму, я лічу, надзвычай важна, што «Славянскі базар» падтрымліваецца дзяржавай і дэманструе той міжнародны ўзровень, да якога трэба імкнуцца».

Неабходнасць падтрымліваць адзін аднаго і больш цікавіцца культурнымі надаткамі суседзяў стала цэнтральнай тэмай прамовы **культуролага, аўтара музычных тэле- і радыёпраграм Мікалая ТЭКЕЛІЕВА**, які ўжо не першы год узначальвае творчую дэлегацыю Балгарыі. «Каго вы ведаеце з балгарскіх артыстаў? — звярнуўся ён да прысутных. — У найлепшым выпадку Кіркорава, нават Лілі Іванаву не згадаеце? Тое самае будзе і ў Балгарыі, калі спытаць, каго ведаюць з беларускіх артыстаў. На сёння наша міжкультурнае супрацоўніцтва вельмі слабае. І тэта, я лічу, праблема, у якой вінаватыя і мы, калегі-журналісты: мы мала гаворым пра іншыя славянскія народы, пра іншыя культуры. Трэба зноў рабіць крокі насустрач адзін аднаму».

Унесла пэўныя заўвагі і **старшыня Віцебскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Тамара КРАСНОВА-ГУСАЧЭНКА.** На яе думку, варта шырэй прадстаўляць і ў культурнай прасторы наогул, і на фестывалі ў прыватнасці, літаратуру: «Фестывалі і конкурсы, якія праходзяць у нашай краіне, у асноўным музычныя. Але ж раней паэтычныя канцэрты збіралі мноства слухачоў, цэлыя стадыёны. І вельмі хацелася б, каб на «Славянскім базары» таксама з'явіліся пляцоўкі для літаратуры».

А вось **рэдактар газеты «Культура» Ілья СВІРЫН** звярнуў увагу калег на такі аспект, як падача матэрыялу: «Многія творчыя асобы, сярод якіх нават жывыя класікі, скардзяцца ў размовах на недахоп увагі. Прычым гэта датычыцца не дыфірамбаў, яны якраз гучаць вельмі часта, а крытыкі — у сэнсе сапраўднай цікавасці да творчасці, глыбокага і ўдумлівага яе аналізу». «Мала захаваць фестываль, яго трэба развіваць і зрабіць такі прадукт, які будзе цікавы ўсяму свету, незалежна ад геаграфіі, — лічыць **папулярны артыст і тэлевядучы Іван ВАБІШЧЭВІЧ.** — Маё пажаданне — каб «Славянскі базар» захаваў культурныя традыцыі, але пры гэтым стаў больш модным і «фірменным».

**Генеральны дырэктар расійскага інфармацыйнага агенцтва InterMedia Яўген САФРОНАЎ** адзначыў, што сусветны трэнд — паскоранае развіццё культуры і медыя, якія зрабіліся літаральна інфармацыйнай зброяй у барацьбе за грамадскую думку. «Даныя найноўшых даследаванняў у гэтай галіне паказваюць, што самы ўплывовы кантэнт утвараюць замежныя карпарацыі. І адзіны спосаб перамагчы іх і захаваць нацыянальную культуру — нарошчваць дзяржаўную прысутнасць, рэалізоўваць у сферы культуры і медыя дзяржаўныя рашэнні і нават кантроль, які неабходна ўзмацніць у дзясяткі разоў».

— Падводзячы вынікі нашай вялікай размовы, асабіста я прыходжу да высновы, што трэба не толькі разумець сучасныя культурныя і інфармацыйныя тэндэнцыі, але і ўкладваць усю душу і розум у тое, што робіш, — будзе гэта мастацкая творчасць альбо матэрыял пра яе ў СМІ, — рэзюмаваў мадэратар круглага стала — **дырэктар — галоўны рэдактар РВУ «Выдавецкі дом «Звязда» Павел СУХАРУКАЎ.** — Давайце працаваць разам, бо культура і медыя ідуць побач. Нездарма існуе жарт, што калі пра цябе не напісалі ў стужцы навін, то цябе не існуе ў прыродзе.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

■ На сцэне

# ДУХМЯНАСЦЬ АДНОЙ ХВІЛІНЫ

## Сюжэт знакамітага фільма, расказаны сродкамі балета

**Як вядома, па венах жанчын цячэ трагедыя, і новая пастаноўка Музычнага тэатра гэта пацвярджае. Нават больш: балет Алега Хадоскі «Тытанік» — прэм'ера адбылася 12 і 13 ліпеня — гэтай жаночай якасцю абумоўліваецца. Таму што не было б невытлумачальных драматычных прыпаданняў галоўнай гераіні да сцяны — не было б падстаў для фатальных матываў у музыцы, халоднай пагарды і гарачых абдымкаў у харэаграфіі, пачуцця незваротнасці ў ледзяным візуальным абыгрыванні катастрофы. У рэпертуары тэатра такім чынам з'явіўся відовішчны балет, які распавядае знакамітую гісторыю перапыненага кахання, — і гэта, праўда, пачуццёва, прыгожа, драматычна. Але.**



Фота Яўгенія СПРУЦЬ.

Услед за прэм'ерай спектакля з нацыянальным вектарам (не так даўно на гэтай жа сцэне ўпершыню паказалі пастаноўку «Жыццё і смерць Янкі Купалы») Музычны тэатр пераключыўся на сюжэт інтэрнацыянальны. Самы шырокавядомы з патанулых караблёў Тытанік неаднаразова станавіўся месцам дзеяння мастацкіх твораў. Стаў і гэтым разам, хоць тут маецца на ўвазе нават не знакамітае судна, а знакамітая гісторыя, напісаная і ўвасобленая рэжысёрам Джэймсам Кэмеранам у адным з самых паспяховых фільмаў свету. Бюджэт карціны «Тытанік» склаў дзвесце мільёнаў долараў, яна атрымала адзінаццаць статуэтак «Оскар», больш за дзесяць гадоў лічылася самым касавым фільмам сусветнага кінематографа. Хто не ведае, як аднойчы на караблі, што павінен патануць, успыхнула каханне дзяўчыны з вышэйшага саслоўя, якая збіраецца выйсці замуж за заможнага мужчыну, з простым хлопцам з трэцяга класа.

Музычны тэатр узяўся за тэатральнае ўвасабленне фільма «Тытанік» сродкамі музыкі, харэаграфіі і мастацкай пастаноўкі, гэта значыць, нічога новага, на жаль, не ствары́ў. Ні сюжэта, ні прачытання, ні нязвыклых сэнсаў — наадварот рызыкнуў прадставіць шматузроўневую гісторыю Джэймса Кэмерана ў прыкладной схеме, магчыма, дастатковай для прыгожых танцаў на сцэне, але якой усё яшчэ не пашкодзілі б метафары, падтэксты і глыбіня.

Я б нават сказала, што гэта нармальна, усё ж такі балет — у першую чаргу пра іншае: пачуццёвую музыку, пластыку, страсці. Сапраўды, магчымасці самой гісторыі тут дугасныя, а «Тытанік» перапрацоўваецца ў спектакль для асалоды: усім вядомая любоўная драма вельмі прываблівае, музыка Алега Хадоскі дазваляе прыйсці ў тэатр толькі каб заплюшчыць вочы і слухаць (дырыжор-пастаноўшчык — Марына Трацякова), складаная харэаграфія дэманструе любоўны тандэм (балетмайстрам-пастаноўшчыкам стаў Сяргей Мікель), усё гэта ўвасабляецца ў эстэтычна якасных сцэнах (мастак-пастаноўшчык — Любоў Сідзельнікава і мастак па святле — Сяргей Азяран).

І ўсё ж ёсць у гэтым варыянце «Тытаніка» некаторыя праблемы. Тое, што большасць гледачоў, я ўпэўненая, памятаюць фільм, іграе і на руку пастаноўшчыкам, і супраць іх. Знакамітая катастрофа, нават больш за тое, асацыюецца з сюжэтам Кэмерана, таму любая адсылка да кінакарціны нараджае ў памяці цудоўную любоўную драму і прымушае звярнуць на сябе ўвагу. «Тытанік» Алега Хадоскі — не проста адсылка да фільма, а відавочны амаж «Тытаніку» Джэймса Кэмерана, ад сюжэта да прамой варыяцыі песні Селін Дыён «My Heart Will Go On». Музычны тэатр можа ўмела выкарыстаць гэта для запаўняльнасці залаў: увасобленне ў тэатры любімага (і, галоўнае, паспяховага) гледачамі фільма сапраўды прыцягвае ўвагу.

Праўда, калі гэтае новае ўвасабленне бачыш на свае вочы — прыходзяць іншыя пачуцці. Фільм «Тытанік» становіцца не проста прывабным арыентырам, а больш дасканалым творам. І хоць «в одну телегу впрячь не можно коня и трепетную лань», параўнанне ўзнікае непазбежна. Мы бачым, як шмат відаў мастацтва цудоўна абыгрываюць «Тытанік» на тэатральнай сцэне, але вонкавая прыгажосць наўрад ці здольная кампенсаваць збядненне вядомай гісторыі і яе часам дзіўнае, без зразумелай матывацыі, цячэнне.

Мы надта шмат і надта добра памятаем фільм Кэмерана. І мы надта дрэнна разумеем прычынна-выніковыя сувязі балета Алега Хадоскі. Спраўшчэнне перайшло межы: галоўная гераіня Маргарэт з'яўляецца на караблі з жаніхом і раптам дэманструе яму сваю незадаволенасць. Дзяўчына самазабыўна пакутуе, прыпадае да сцяны, адважваецца на самагубства. Усё так імкліва адбываецца, што сам балет не паспявае растлумачыць свае падзеі і ставіць, здаецца, на жаночую схільнасць да драматызавання і ахвочасць гледачоў да страсцей, кахання і трагічнага фіналу. Праўда, «вонкавасць» пастаноўкі настолькі вялікая, што нават пачуццямі праз прапанаваныя інструменты заражаешся са скрыгатам.

У самы фатальны момант Маргарэт сустракае Джэймса, які не дае ёй сігануць у ваду, з чаго пачынаецца іх гісторыя кахання — тыя ж танцы на палубе трэцяга класа, пасцельная сцэна і ўцяканне ад жаніха. Толькі што культавую сцэну з разведзенымі рукамі на карме не абыгралі.

Усё гэта выглядае прыстойна, а не банальнымі істэрыкамі і капрызамі толькі дзякуючы бэкграўнду, дзе значыцца прагляд фільма. Каханне, трэба сказаць, на сцэне Музычнага тэатра становіцца сапраўды прыгожай гісторыяй праз музыку, далікатныя рухі і сіні колер. У момант катастрофы ў яго нават можна паверыць, гледзячы на тое, як страстна і шматразова Маргарэт у мітусні скача на Джэймса.

На «Тытанік» прыемна глядзець, глядзець і слухаць. І хоць вонкавая эстэтыка мае надзвычайнае значэнне, за ёй у гэтым выпадку абсалютнае і «папсовае» запазычанне, непрапрацаваная логіка паводзін і неапраўданыя страсці. А ўсё, што не імкнецца да новага, базуецца на чужым поспеху, не дае нічога апроч прыгажосці, застаецца духмянасцю адной хвіліны.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ**

# ЗНЯЦЬ ЦІСК

## Чаму трэба не проста ўжываць лекі ад гіпертаніі, а дасягаць мэтавых лічбаў

**Сёння мільярд чалавек на планеце, па звестках Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, пакутуе на павышаны артэрыяльны ціск, а да 2025 года іх будзе 1,5 мільярда. Сардэчна-сасудзістыя хваробы — найбольш распаўсюджаная прычына смерці ва ўсім свеце, іх нават называлі эпідэміяй ХХ стагоддзя. Цалкам верагодна, што ў гэтым стагоддзі тэндэнцыя захаваецца.**



### ХВАРОБА ЛАДУ ЖЫЦЦЯ

У Беларусі адно з першых месцаў займаюць хваробы сістэмы кровазвароту — больш за 20 % ад усіх хвароб. Пры гэтым на высокім узроўні аказваецца кардыялагічная дапамога. Як адзначыў **галоўны спецыяліст упраўлення арганізацыі медыцынскай дапамогі Міністэрства аховы здароўя Аляксандр ВЕРБАВІКОЎ**, акрамя Мінска і ўсіх абласных цэнтраў, высокатэхналагічная кардыялагічная дапамога даступная ў буйных міжраённых цэнтрах — Пінску, Салігорску, Баранавічах, у найбліжэйшы час яна будзе наладжана ў Навапалацку, а затым у Мазыры, Лідзе, Бабруйску.

Укараненне высокіх тэхналогій, адкрыццё сучасных ангіяграфічных кабінетаў, вялікія матэрыяльныя ўкладанні ў кардыёхірургічную дапамогу, эндаваскулярную хірургію дазволілі знізіць смяротнасць ад вострага інфаркту міякарда на 15 %, а іншых вострых формаў, вострага каранарнага сіндрому — на 48 %, расказала **вядучы навуковы супрацоўнік лабараторыі артэрыяльнай гіпертаніі РНПЦ «Кардыялогія», кандыдат медыцынскіх навук Таццяна НЯЧОСАВА.** Спецыяліст адзначыла, што лячэнне інфаркту міякарда пачынаецца яшчэ ў хатніх умовах — ад першага болевага сіндрому. Пры неабходнасці хворыя ў першыя гадзіны праходзяць стэнціраванне, дзякуючы чаму аднаўляецца крывацёк у той артэрыі, ад паражэння якой мог бы развіцца інфаркт. Гэтыя ўнікальныя методыкі ў цяперашні час у Беларусі ўкаранёныя і добра развіваюцца. Пры тым, што Беларусь — краіна высока развітых медыцынскіх тэхналогій, Таццяна Нячосава звярнула ўвагу на той факт, што беларусы мала зацікаўленыя пытаннямі прафілактыкі сардэчна-сасудзістых хвароб:

— Медыкі цяпер могуць перасадзіць сэрца, ныркі, печань, замяніць суставы, але ці спадабаецца вам жыццё пасля такіх аперацый? Важна не даводзіць справу да трансплантацыі, і на сёння гэта цалкам магчыма. Пра прафілактыку казаў яшчэ старажытны філосаф Дэмакрыт: «Падобна таму, як бываюць хваробы цела, бываюць хваробы ладу жыцця». Дык вось з ладам жыцця ў нас ёсць праблемы. Па ініцыятыве Сусветнай арганізацыі аховы здароўя з падтрымкай Міністэрства аховы здароўя было праведзена даследаванне Steps. І сумна бачыць гэтыя лічбы: 27 % насельніцтва ад 18 да 69 гадоў штодзённа курыць, а па звестках Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, смяротнасць у курыльшчыкаў павялічваецца ў 1,76 раза. Больш за палову апытаных — 52 % — ужывалі алкаголь на працягу апошняга месяца, у рацыёне 73 % беларусаў менш за 5 порцый фруктаў і гародніны ў дзень. А яны, між іншым, павінны быць асновай нашага харчавання. Прычым гэта неабавязкова экзатычныя фрукты, наадварот, больш карысныя мясцовыя: морква, буракі, капуста, яблыкі. У выніку амаль 61 % маюць лішнюю вагу цела. А гэта не эстэтычны фактар, а захворванне. Калі яно маецца, не можа быць нармальных лічбаў артэрыяльнага ціску.

### МІНІМІЗАВАЦЬ ФАКТАРЫ РЫЗЫКІ

Спецыяліст падкрэсліла, што ў Еўропе кардыёлагі кожныя пяць гадоў ацэньваюць, як удалося мінімізаваць фактары рызыкі. Такім чынам, за апошнія 15 гадоў агульны халестэрын у насельніцтва знізіўся амаль на 70 %. А вось атлусценне павысілася на 13 %, нягледзячы на ўсе намаганні. Услед за ім на 11 % павысілася колькасць пацыентаў з цукровым дыябетам і практычна на столькі ж — людзей з павышаным артэрыяльным ціскам. Таму, паводле апошніх еўрапейскіх рэкамендацый, неабходна тэрмінова спыніць эпідэмію атлусцення. Таццяна Нячосава адзначыла, што ў Беларусі вісцэральнае атлусценне, якое вызначаецца па аб'ёме таліі (пры ім тлушч абвалаквае ўнутраныя органы), маюць 64 % жанчын і 42 % мужчын.

— З такой сітуацыяй трэба змагацца. І неабходная інфраструктура ў нас ёсць: спартыўныя школы, стадыёны, басейны. І прывіваць здаровы лад жыцця трэба з дзяцінства, пачынаючы з сям'і. Калі мы знізім ужыванне солі, на 26 % знізім паказчыкі смяротнасці ад ішэмічнай хваробы сэрца. Не набывайце дзецям салёныя сухарыкі, чыпсы. Частуючы іх салёнымі прадуктамі, мы змяняем іх смакавыя рэцэптары, дзіця з часам будзе дасольваць ежу, а ў такім выпадку гіпертанія непазбежная. Сальніцу са стала лепш прыбраць назаўсёды.

### ЛЯЧЫЦЦА, ДАСЯГАЮЧЫ МЭТЫ

Для пацыентаў з артэрыяльнай гіпертэнзіяй важна пастаянна прымаць таблеткі. Таццяна Нячосава падкрэсліла, што ў Беларусі для лячэння артэрыяльнай гіпертэнзіі маюцца ўсе прэпараты, якія выпускаюцца ў свеце. Больш за тое, айчынная прамысловасць асвоіла выпуск усіх груп прэпаратаў, якія зніжаюць артэрыяльны ціск. А вось пытанне прыхільнасці да лячэння стаіць ва ўсім свеце:

— За тры месяцы большай часткі гіпертонікаў можна знізіць ціск да нармальных лічбаў. І пацыент лічыць, што выканаў свае абавязкі перад урачом, — і спыняе прыём лекаў. А гэта самы цяжкі фактар, бо ён павышае варыянтнасць ціску: сёння высокі, заўтра нізкі... Пацыент чакае, пакуль ціск зноў будзе высокі. І на яго фоне можа здарыцца гіпертанічны крыз і парушэнне мазгавога кровазвароту. Нерэгулярны прыём гіпатэнзіўных прэпаратаў можа прывесці да сардэчна-сасудзістых катастроф. І яшчэ адзін важны момант: трэба не проста прыняць таблетку, а прыняць яе, дасягаючы мэты — нармальных лічбаў артэрыяльнага ціску. Калі мы лечым пнеўманію, нікому не прыйдзе ў галаву закрыць бальнічны, пакуль не зрабілі кантрольны рэнтген і не ўзялі кроў. А гіпертонік, не дасягнуўшы мэтавага ўзроўню ціску, лічыць, што ён лечыцца. Паводле даследавання Steps, толькі 9 % пацыентаў дасягаюць мэтавага ўзроўню ціску. Гэта раўназначна таму, што ў цэлым наша насельніцтва не лечыцца. Таму ўсе пацыенты павінны засвоіць: калі лечым атэрасклероз, варта дасягаць мэтавых паказчыкаў халестэрыну; калі лечым гіпертанію, варта дасягаць мэтавага ўзроўню артэрыяльнага ціску.

Як дадала Таццяна Нячосава, па звестках Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, 3/4 смяротных выпадкаў сасудзістых хвароб можна пазбегнуць за кошт фарміравання здаровага ладу жыцця і карэкцыі паводзін.

Аляксандр Вербавікоў паведаміў, што ў Беларусі ў апошнія гады назіраецца нязначная станоўчая дынаміка па захваральнасці сардэчна-сасудзістай сістэмы: у 2016-м выяўлялася 39 100 чалавек на 100 тысяч насельніцтва, у 2017-м гэта паказчык складаў 38 885 чалавек. У пэўнай ступені гэтаму спрыяюць адукацыйныя акцыі па прафілактыцы неінфекцыйных хвароб, якія праводзяцца ў Беларусі некалькі апошніх гадоў. У першым паўгоддзі 2018-га адбылося 2116 мерапрыемстваў ва ўстановах аховы здароўя, гіпермаркетах, на рынках, у магазінах, на прадпрыемствах і ва ўстановах адукацыі. Удзельнікам прапануюць змерыць артэрыяльны ціск, ацаніць фактары рызыкі смерці ад сардэчна-сасудзістых хвароб у наступныя 10 гадоў і інш. У такіх акцыях толькі ў сталіцы ўдзельнічала 135,5 тысячы чалавек — кожны дзясяты мінчанін.

**Матэрыялы падрыхтавала Алена КРАВЕЦ.**

---

■ Пытанне-адказ

# Не саліць і не пярчыць

*— Як правільна харчавацца з дыягназам «хранічная сардэчная недастатковасць»?*

**В. Ільюшэнка,** *г. Магілёў.*

**Адказвае загадчык аддзялення прафілактыкі 31-й гарадской паліклінікі г. Мінска Таццяна ПЛІСЮК.**

— Хранічная сардэчная недастатковасць (ХСН) — захворванне з комплексам характэрных сімптомаў: задышкай, стамляльнасцю, зніжэннем фізічнай актыўнасці, якія звязаны з недастатковым кровазабеспячэннем органаў у стане пакою ці падчас нагрузкі. Як правіла, ХСН з'яўляецца наступствам нялечанай ішэмічнай хваробы сэрца ці прагрэсам гэтага захворвання. Часта хвароба суправаджаецца затрымкай вадкасці ў арганізме. Звычайна гэта ўзроставыя і дастаткова цяжкія пацыенты, якіх лёгка вызначыць па ацёках на нагах, твары, нярэдка яны маюць варыкознае расшырэнне вен. Каб вадкасць не затрымлівалася ў арганізме, у тым ліку ў сардэчнай сумцы і лёгкіх, хворым важна



прытрымлівацца ўмеранага пітнога рэжыму і абмяжоўваць ужыванне солі. Два літры вады ў суткі — гэта рэкамендацыя для фізічна актыўных людзей больш маладога ўзросту. Для пацыентаў з ХСН норма складае каля літра вадкасці. Яе індывідуальна разлічвае ўрач, зыходзячы з узросту і маса цела. Варта памятаць, што пры падліку вадкасці трэба ўключаць не толькі ваду, але і кампоты, гарбату, супы — усё, што ўжываеце за дзень. У летнюю спякоту магчыма крыху павялічыць гэту норму.

Абмежаванне солі таксама неабходная мера, бо соль затрымлівае вадкасць у арганізме. Ужываць трэба не больш за паўтара грама ў суткі. Гэта значыць, што ежу лепш увогуле не саліць, бо соль вытворцы дадаюць ва ўсе гатовыя прадукты, якія мы набываем, напрыклад, у той жа хлеб. Не варта і пярчыць стравы, бо спецыі ўзмацняюць смагу. Дарэчы, хворым з артэрыяльнай гіпертэнзіяй абмяжоўваць ужыванне солі таксама важна, але тут норма — 5-6 грамаў у суткі.

Вітаміны — важная складальная харчавання ўсіх людзей, у тым ліку і хворых з ХСН. Ім карысныя чарнасліў, курага, разынкі, якія ўтрымліваюць калій. Таксама ён уваходзіць у склад такіх прэпаратаў, як аспаркам, панангін, яны паляпшаюць сардэчную дзейнасць. Многія ўвогуле лічаць калій ледзьве не панацэяй, але тут ёсць асаблівасці. Важна памятаць, што пры ХСН у некаторых пацыентаў можа ўзнікнуць гіперкаліемія: такі эфект дае малая колькасць ужытай вадкасці ў сукупнасці з прэпаратамі калію. Таму перад іх прыёмам неабходна атрымаць рэкамендацыю ўрача, які арыентуецца на паказчыкі біяхімічнага аналізу крыві і ацэньвае стан пацыента. Многія хворыя з ХСН і самі ведаюць: калі сёння з'еў нешта салёнае, заўтра трэба выпіць мачагонны прэпарат, бо ў адваротным выпадку з'явяцца ацёкі, а да мачагоннага трэба дадаваць прэпарат калію.

ХСН лечыцца медыкаментознымі метадамі, пацыенты павінны пастаянна прымаць прэпараты, а дыета — толькі дадатак, які дапамагае не ўзмацняць цячэнне хваробы. Акрамя дыеты павінна прысутнічаць і хоць бы мінімальная рухальная актыўнасць. Карысная тая ж дыхальная гімнастыка з раніцы, бо калі ХСН суправаджаецца застоем па малым крузе кровазвароту, такія пацыенты пакутуюць ад кашлю. Памяшканне, дзе знаходзяцца такія хворыя, павінна добра праветрывацца і асвятляцца, каб не з'яўлялася вільгаці і цвілі, якія садзейнічаюць узнікненню прастуды і вірусных інфекцый. Па меры магчымасці пацыенты з ХСН павінны выходзіць на пешыя прагулкі ■

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**ЛОТ 1:** капитальное строение, инв. № 421/С-7277 (назначение – здание многоквартирного жилого дома, наименование – жилой дом), площадью 311,8 кв. м, расположенное по адресу: г. п. Вороново, ул. Юбилейная, 3Б. Оборудование – пожарная сигнализация

Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый номер 421355100003000764 (назначение – земельный участок для обслуживания многоквартирного жилого дома), площадью 0,1815 га, расположенном по адресу: г. п. Вороново, ул. Юбилейная, 3Б. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земельные участки, расположенные в охранных зонах электрических сетей, код – 5,2, площадью 0,0024 га

Начальная цена продажи – 59 832,18 руб. (пятьдесят девять тысяч восемьсот тридцать два рубля восемнадцать копеек) с учетом НДС

Сумма задатка – 2 992 руб. (две тысячи девятьсот девяносто два рубля)

Продавец – Вороновский филиал Гродненского областного потребительского общества, 231391, Гродненская область, г. п. Вороново, ул. Калинина, 4, тел. 8 01594 217-83

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 45-05-38

Условия аукциона: без условий. Условия оплаты – 100 % предоплата. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов

Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

**Аукцион состоится 30 июля 2018 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3-209**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами: заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка; *физическим лицом* – паспорт (документ, его заменяющий) и его копия; *юридическим лицом и ИП – резидентами Республики Беларусь* – заверенные копии учредительных документов; *юридическим лицом - нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе представителем организатору аукциона предъявляется документ, подтверждающий полномочия представителя, и документ, удостоверяющий его личность. Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона. Продавец имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным.

В процессе торгов начальная цена повышается в соответствии с шагом аукциона аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Срок возмещения затрат на организацию и проведение аукциона – 3 рабочих дня.

**Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» 07.04.2018 г.**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Последний день приема заявлений – 25 июля 2018 г. до 15.00**

*Телефоны для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» http://grodnoino.by*

## Управление принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома объявляет о проведении торгов по продаже имущества, принадлежащего ГП «ПМК-26» (УНП 300444655)

| | |
|---|---|
| Наименование (описание) имущества и его стоимость | Лот № 1. Экскаватор ЭО 3223, 2007 года выпуска, регистрационный знак ВА-2 5296, с установленной начальной ценой 13 840 рублей.<br>Лот № 2. Автобус PAZ 3205, 1997 года выпуска, регистрационный знак АЕ 0141-2, с установленной начальной ценой 1 360 рублей.<br>Лот № 3. Автомобиль ГАЗ 5201, 1988 года выпуска, регистрационный знак АА 1524-2, с установленной начальной ценой 640 рублей |
| Наличие обременений | Отсутствуют |
| Местонахождение имущества | г. Чашники, переулок Молодежный, 4 |
| Место, дата и время проведения торгов | 03.08.2018 г. в 09.00, г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1, каб. 2.4 |
| Справочная информация об организаторе торгов | Управление принудительного исполнения ГУЮ Витоблисполкома (г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1 www.vitebskjust.gov.by).<br>Судебный исполнитель – Деревнин Сергей Евгеньевич, тел./факс. (0212) 61 40 08, (033) 687 91 44. |
| Условия и порядок проведения торгов | Лицо, желающее принять участие в торгах, до начала торгов обязано:<br>1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством.<br>2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет управления принудительного исполнения ГУЮ Витоблисполкома IBAN BY73AKBB36429030010372000000 в ф-ле 200 ОАО «АСБ Беларусбанк», BICAKBBBY21200, УНП 300002505, не позднее 17.00 02.08.2018.<br>Величина первого шага составляет 5 процентов начальной стоимости выставленного на торги имущества (лота).<br>В соответствии со статьей 97 Закона Республики Беларусь «Об исполнительном производстве» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги (покупателем) |

Утерянный представительством Белгосстраха по Фрунзенскому району г. Минска бланк страхового полиса по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу формы 2РН, 2РП серии БЛБ № 1084272 **считать недействительным.**

УНП 100122726

БТА БАНК

## Бухгалтерский баланс на 1 июля 2018 г. Наименование банка ЗАО «БТА Банк»

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.07.2018 | 01.01.2018 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 5 627 | 4 815 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | - | - |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 13 886 | 11 690 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 6 991 | 12 114 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 31 560 | 30 954 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 93 707 | 70 870 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | - | 5 |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | - | - |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 8 581 | 9 571 |
| 11 | Доходные вложения в материальные активы | 1110 | 808 | - |
| 12 | Имущество, предназначенное для продажи | 1111 | - | - |
| 13 | Отложенные налоговые активы | 1112 | - | - |
| 14 | Прочие активы | 1113 | 1 051 | 1 099 |
| 15 | **ИТОГО активы** | **11** | **162 211** | **141 118** |
| 16 | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| 17 | Средства Национального банка | 1201 | - | - |
| 18 | Средства банков | 1202 | 21 138 | 18 008 |
| 19 | Средства клиентов | 1203 | 80 730 | 71 926 |
| 20 | Ценные бумаги банка | 1204 | 14 969 | 6 245 |
| 21 | Производные финансовые обязательства | 1205 | 9 | 102 |
| 22 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | - | - |
| 23 | Прочие обязательства | 1207 | 430 | 447 |
| 24 | **ВСЕГО обязательства** | **120** | **117 276** | **96 728** |
| 25 | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | |
| 26 | Уставный фонд | 1211 | 24 747 | 24 747 |
| 27 | Эмиссионный доход | 1212 | - | - |
| 28 | Резервный фонд | 1213 | 1 246 | 1 144 |
| 29 | Фонды переоценки статей баланса | 1214 | 7 260 | 7 215 |
| 30 | Накопленная прибыль | 1215 | 11 682 | 11 284 |
| 31 | **ВСЕГО собственный капитал** | **121** | **44 935** | **44 390** |
| 32 | **ИТОГО обязательства и собственный капитал** | **12** | **162 211** | **141 118** |

## ОТЧЕТ о прибылях и убытках на 1 июля 2018 г.

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.07.2018 | 01.07.2017 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 5 127 | 6 225 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 2 285 | 1 853 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 2 842 | 4 372 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 2 451 | 1 250 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 180 | 109 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 2 271 | 1 141 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | - | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | (78) | (2) |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | 864 | 769 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | (5) | (92) |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | (48) | (740) |
| 12 | Прочие доходы | 208 | 114 | 241 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | 5 302 | 5 221 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | 159 | 110 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | 595 | 1 838 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | 98 | 264 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 497 | 1 574 |

Председатель Правления А. В. Доронкевич

Главный бухгалтер Т. Н. Ковалева

Дата подписания: 9 июля 2018 г.

ЗАО «БТА Банк» Лицензия НБ РБ № 17 от 28.05.2013 г. УНП 807000071

## РУП «Торговый дом «Восточный» извещает о проведении 22.08.2018 открытого аукциона по продаже недвижимого имущества

**Лот № 1.** Капитальное строение с инвентарным номером 330/С-7240, расположенное по адресу: Гомельская обл, г. Мозырь, ул. Коммунальная, 2, общей площадью – 1264 кв. м, назначение – здание деревообрабатывающего цеха, наименование – одноэтажное кирпичное здание деревообрабатывающего цеха. Год постройки – 1968. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 341500000006000288, площадью 2,62 га. **Начальная цена продажи – 296 892,00 рубля, задаток – 29 689,20 рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 2.** Капитальное строение с инвентарным номером 640/С-27128, расположенное по адресу: г. Слуцк, ул. Ленина, 292, общей площадью – 671,9 кв. м, назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – здание вспомогательного корпуса. Год постройки – 1999. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 642500000001000678, площадью 4,5076 га. **Начальная цена продажи – 71 496,00 рубля, задаток – 7 149,60 рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 3.** Капитальное строение с инвентарным номером 640/С-27117, расположенное по адресу: г. Слуцк, ул. Ленина, 292, общей площадью – 926,0 кв. м, назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – здание склада, гаража. Год постройки – 1976. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 642500000001000678, площадью 4,5076 га. **Начальная цена продажи – 91 368,00 рубля, задаток – 9 136,80 рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 4.** Капитальное строение с инвентарным номером 640/С-68376, расположенное по адресу: г. Слуцк, пер. 4-й Новый, 5А, общей площадью – 149,7 кв. м назначение – здание неустановленного назначения, наименование – бытовые помещения. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 642500000001000080, площадью 1,3627 га. **Начальная цена продажи – 43 092,00 рубля, задаток 4 309,20 рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 5.** Капитальное строение с инвентарным номером 100/С-44287, расположенное по адресу: г. Брест, ул. Красногвардейская, 148А, общей площадью – 5720,8 кв. м, назначение: здание специализированное железнодорожного транспорта, наименование – пакгауз. Год постройки – 1986. Расположено на земельных участках с кадастровыми номерами 140100000001007787 площадью 1,1046 га, 140100000001023257 площадью 0,0212 га, 140100000001023258 площадью 0,1313 га, 140100000001023259 площадью 0,8284 га. **Начальная цена продажи – 1 161 000,00 рубля, задаток – 116 100,00 рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 6.** Капитальное строение с инвентарным номером 100/С-58417, расположенное по адресу: г. Брест, ул. Красногвардейская, 148А, общей площадью – 771,5 кв. м, назначение: сооружение специализированное железнодорожного транспорта, наименование – железнодорожный путь № 22, союзная колея. Год постройки – 1963. Расположено на земельных участках с кадастровыми номерами 140100000001022878 площадью 0,0865 га, 140100000001022879 площадью 0,1167 га, 140100000001023259 площадью 0,8284 га. **Начальная цена продажи – 395 100,00 рубля, задаток – 39 510,00 рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 7.** Капитальное строение с инвентарным номером 100/С-87928, расположенное по адресу: г. Брест, ул. Красногвардейская, 148Б, общей площадью – 49,0 кв. м, назначение: сооружение специализированное складов, хранилищ, наименование – убежище. Год постройки – 1978. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 140100000001023256 площадью 1,8866 га. **Начальная цена продажи – 20 790,00 рубля, задаток – 2 079,00 рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 8.** Капитальное строение с инвентарным номером 100/С-75375, расположенное по адресу: г. Брест, ул. Красногвардейская, 146А/2, общей площадью – 167,9 кв. м, назначение: здание административно-хозяйственное, наименование – здание административно-хозяйственное. Год постройки – 2013. Расположено на земельном участке с кадастровым номером 140100000001010124 площадью 1,2862 га. **Начальная цена продажи – 78 030,00 рубля, задаток – 7 803,00 рубля. Шаг аукциона – 5 %.**

**Лот № 9.** Капитальное строение с инвентарным номером 100/С-58419, расположенное по адресу: г. Брест, ул. Красногвардейская, 148А, общей площадью – 997,5 кв. м, назначение: сооружение специализированное железнодорожного транспорта, наименование – земляное полотно. Год постройки – 1963. Расположено на земельных участках с кадастровыми номерами 140100000001022881 площадью 0,3969 га, 140100000001022882 площадью 0,0244 га, 140100000001023259 площадью 0,8284 га. **Начальная цена продажи – 324 900,00 рубля, задаток – 32 490,00 рубля. Шаг аукциона – 5 %**

УСЛОВИЯ

1. Победитель аукциона либо в случае, если заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5 % (пять процентов), – Претендент на покупку не позднее 3 рабочих дней со дня проведения аукциона на основании счета-фактуры возмещает затраты на организацию и проведение аукциона и оплачивает стоимость приобретенного объекта не позднее 20 (двадцати) рабочих дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.
2. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством РБ для победителя аукциона. Организация и проведение аукциона осуществляются в соответствии с действующим законодательством РБ

**Аукцион состоится 22.08.2018 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Уручская, 27, актовый зал**

Задаток перечисляется на р/с BY81POIS30120021178401933001 БИК POISBY2X, ОПЕРУ ОАО «Паритетбанк», 220002, г. Минск, пр-т Независимости, 77 , ОКПО 37411910, получатель – РУП «Торговый дом «Восточный», УНП 101127633.

Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже капитального строения (изолированного помещения), земельного участка, Лот № ___, проводимом 22 августа 2018 года.

Заявление на участие и необходимые документы принимаются по адресу: г. Минск, ул. Уручская, 14а, управление по реализации недвижимости, в рабочие дни: пн.–чт. – с 08.30 до 13.00, с 14.00 до 17.30, пт. – с 8.30 до 13.00, с 14.00 до 16.15. **Окончание приема заявлений 17.08.2018 в 14.00.**

**Лот может быть снят с аукциона Организатором по письменном указанию Департамента в любое время до объявления его проданным**

**Контакты организатора аукциона: +375 17 351 00 01, +375 17 380 27 37, +375 44 763 62 63, +375 29 551 06 05, +375 29 660 43 51**

## ОАО «Гомельоблреклама» (продавец) извещает о проведении 2 августа 2018 года открытого повторного аукциона по продаже имущества со снижением начальной стоимости на 20 % в 11.00 в г. Гомеле по ул. Гагарина, 20

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб. | Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | **Капитальное строение с инв. № 350/С-42584, общей площадью 1 616,7 кв. м,** назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – **административный корпус.** Составные части и принадлежности: **галерея**. Забор железобетонный **36,0 п. м** (инв. № 114), вертикальные планировки и благоустройство (инв. № 12), в т. ч.: проезжая часть **632,0 кв. м**, борты **42,0 п. м**; озеленение 7 деревьев (инв. № 13); распредустройство – 3 шт. (инв. № 32). **Информация о земельном участке:** кадастровый номер **340100000006004802 площадью 0,1849 га** – для эксплуатации и обслуживания административного здания (право аренды). **Местонахождение:** Гомельская область, г. Гомель, ул. Борисенко, д. 7 | **260 136,00** | **13 006,80** |
| 2 | **Капитальное строение с инв. № 350/С-42579, общей площадью 232,7 кв. м,** назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – **здание автоматизированного склада цемента,** расположенное на земельном участке с кадастровым номером **340100000006004801 площадью 1,0851 га.** Составные части и принадлежности: **элеваторы, 2-й свет, лестница, площадка, навес. Местонахождение:** Гомельская область, г. Гомель, ул. Борисенко, д. 7/5 | **172 000,00** | **8 600,00** |

**Продавец:** ОАО «Гомельоблреклама», г. Гомель, ул. Гагарина, 20. **Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.:** 8 (0232) 23-23-53 – Ирина Борисовна. **Шаг аукционных торгов – 5 %. Для участия в аукционе необходимо:** 1. Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца имущества (ОАО «Гомельоблреклама»):** р/с BY34BAPB30122093700130000000, БИК BAPBBY2X, ОАО «Белагропромбанк», УНП 400071204, ОКПО 285728963000, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления). 2. Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 18 июля 2018 г**. по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00. **Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 31 июля 2018 г. в 16.00. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются.**

**Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за три дня до его проведения.** В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом имущества** в течение **5 (пяти)** рабочих дней со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **20 (двадцати) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи и возместить затраты на организацию и проведение аукциона в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. **В соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь может быть предоставлена рассрочка оплаты имущества**. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части).

**Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 13.06.2018 г. № 111(28727). Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, раздел «Аукционы». Дополнительная информация по контактным телефонам организатора аукциона: 8 (0232) 23-23-54 (тел./факс), 23-23-56, 8 (029) 126-66-62.**

# ПАРТАЛ У ЧАСЕ

## З успамінаў франтавога журналіста-звяздоўца



Ліпень 1944 г. Рэдакцыя і тыпаграфія газеты «Защитник Родины» (трэці ў ніжнім радзе Дзмітрый МАЛЕВІЧ).

**Гісторыя Вялікай Айчыннай вайны: глыбока даследаваная і ў той жа час шмат у чым невядомая. Гэта акіян трагічных і гераічных лёсаў, сусвет слёз і перажыванняў, гора і пакут, страт і сустрэч... Дзённікаў звычайна не вялі на вайне: нельга было дапусціць, каб сакрэтныя альбо іншыя важныя звесткі трапілі ў баі да саперніка або ў рукі шпіёна. Таму знайсці франтавы дзённік — вялікая ўдача.**

*Яго маглі весці нямногія, напрыклад франтавыя журналісты, паколькі запісы станавіліся каштоўнай падмогай у іх прафесійнай дзейнасці.*

*Ці можна апісаць маю радасць, калі я, Аляксандр Сявенка, — гродзенскі краязнавец і калекцыянер, па прафесіі — ваенны журналіст — стаў шчаслівым уладальнікам такога дзённіка, набыўшы яго на мясцовай барахолцы. Стары дзённік аказаўся сапраўдным парталам у часе, з шэптам старонак, які пераносіць чытача ў грозны час вайны. Я не змог заплюшчыць вачэй у тую ноч, пакуль не дачытаў яго да канца ад вокладкі да вокладкі. Неўзабаве я зразумеў, што трэба падзяліцца гэтай інфармацыяй з іншымі, апублікаваць каштоўныя матэрыялы. Аўтарам франтавога дзённіка аказаўся мінчанін Дзмітрый Малевіч. Дзмітрый Паўлавіч да вайны працаваў у рэдакцыі газеты «Звязда». Вось найбольш цікавыя фрагменты з дзённіка франтавога журналіста, якія публікуюцца ўпершыню.*

### 1941 год.

**22 чэрвеня.** Нядзеля. Знаходжуся з жонкай у Цітве. У паветры з'явіліся самалёты дзіўнай формы і з непрыемным гукам. Нейкае нядобрае прадчуванне, трывожна. Апоўдні атрымаў паведамленне ад мясцовых калгаснікаў, якія прыбылі з Мінска, што ў горадзе пажары, вораг робіць налёты. Не веру.

А 17-й гадзіне каля Цітвянскай школы праходзіць кароткі мітынг. Прадстаўнік райкама партыі аб'яўляе, што Германія напала на СССР. Настрой цяжкі. Адпраўвіўся на станцыю, каб ехаць у Мінск. Там упершыню пачуў разрывы нямецкіх бомбаў...

**23 чэрвеня.** У Мінск прыехаў а 9-й гадзіне раніцы. Над станцыяй разрывы, кружаць нямецкія самалёты. Насельніцтва з чамаданамі і звязкамі кідаецца па пероне, вуліцы неяк незвычайна шматлюдныя... Заходжу ў «Звязду». Заспеў Шляфера (намеснік галоўнага рэдактара газеты. — **Аўт.**). Ад бяссонных начэй у яго запалі вочы, ускудлачаныя валасы. Каля стала сядзяць Грыша Клябанаў, Павел Кавалёў. Ва ўсіх стомлены выгляд. Газету выпусцілі на дзвюх палосах. Аб эвакуацыі ніхто не думае...

А 10-й гадзіне з захаду пачуўся страшны гул матораў, якія зліліся ў адзін гук. З боку пасажырскага вакзала на гарызонце паказалася чорная паласа. Вось ужо відаць самалёты... Я ўпаў каля трохтонкі і моцна ўчапіўся ў траву. І проста на мяне ляцяць бомбы. Ад разрыву адной з іх машына, пад якой я ляжаў, захісталася, яе адкінула ў бок. Бомбы разрываліся вакол мяне, стагнала зямля. Калі я падняўся, каля галавы ўбачыў варонку, у якой схавалася б тая трохтонка, пад якой я знаходзіў сховішча ад смерці. Калі яе валяліся чыесьці ногі, шматкі штаноў... Горад ахутаны гарам і пылам, штохвілінна паветра прарэзваецца нямецкімі кулямі з самалётаў...

Жыхары са звязкамі хатніх рэчаў мітусіліся па агародах, хаваліся ў падвалах. Пачалося нешта страшнае...

**24 чэрвеня.** Начаваў у склепе... Горад апусцеў. Для таго каб перайсці на другі бок вуліцы, трэба пераступаць цераз трупы, горы цэглы...

Рухаемся на Магілёў... Гэтая магістраль ніколі не бачыла столькі людзей, як у той дзень. Ішлі старыя, цягнучы на спінах свой скарб, які гадамі здабывалі мірнай працай... Бывай, родны мой горад. Мы хутка вернемся. Абавязкова вернемся.

**30 чэрвеня.** Прыехалі ў Рослаў. Начаваў у кузаве. Змучаны, брудны і стомлены, я раніцай пайшоў у рэдакцыю гарадской газеты. Дамаўляюся аб рабоце сакратаром рэдакцыі. На другі дзень прыезду прыпісаўся ў ваенкамаце, а 9 ліпеня атрымаў павестку аб прызыве.

**14 ліпеня.** Самы памятны дзень у маім жыцці. На 38-м годзе жыцця ўпершыню надзеў салдацкую гімнасцёрку. Вінтоўкі не атрымаў. Увечары накіравалі ў Крычаў. Туды прарываўся вораг. Мяне залічылі радавым 1-га ўзвода, 1-й роты, 2-га рабочага батальёна. Пачалося ваеннае жыццё...

Жонка не плакала, толькі падзіцячы ўглядалася ў рысы майго твару, імкнучыся запомніць іх. У гэтым таямнічым поглядзе я зразумеў тое, чаго не мог зразумець усе пражытыя разам 13 гадоў. Мы развіталіся, жонка спытала:

— Што рабіць далей, куды табе пісаць?

Адраса я яшчэ не меў, але адказаў:

— Пішы куды-небудзь.

Сляза пакацілася па яе твары. Яна выцерла яе батыставай насоўкай і перадала яе мне:

— Вазьмі, спатрэбіцца.

Гэтую насоўку я пранёс праз усе гады вайны...

**8—27 жніўня.** Размясціліся за 5 кіламетраў ад станцыі Бялынкавічы Магілёўскай вобласці. Немцы знаходзяцца за лесам. А 21-й гадзіне атрымалі загад эвакуіравацца. Усе працавалі на пагрузцы боепрыпасаў... 12 дзён эшалон стаяў у Старадубе... Немец займаў Унечу, і ўсе шляхі для эвакуацыі былі адрэзаны. Я сеў на адкрытую платформу, адкрыў скрыню з гранатамі і падрыхтаваўся да сустрэчы з немцамі... Сем кіламетраў наш эшалон суправаджалі нямецкія танкі, якія імкнуліся ў Старадуб. Відаць, немцы вырашылі, што гэта быў іх эшалон. На станцыі Хутар-Міхайлаўскі трапілі пад моцную бамбёжку...

**5 лістапада.** Прыбылі на станцыю Атрошкі Варонежскай вобласці. Тут упершыню за ўвесь час памыўся ў лазні. Ад доўгіх паходаў на ступні адбалела так шмат скуры, што ў лазні ад яе адставалі цэлыя пласты.

**17 снежня.** Ліпецк — выдатны курортны гарадок. Тут сустрэў Рабіновіча, Гурскага, Крапіву і іншых мінчан...

### 1942 год.

**З 8 сакавіка да 20 чэрвеня...** Хутка год, як не атрымліваю пісьмаў ад жонкі. Пасылаю ва ўсе ваенкаматы краіны пісьмы з просьбай паведаміць адрас маёй жонкі. Паслаў ужо 310 паштовак. Атрымаў 150 адказаў: «Не значыцца». 151-ы адказ у сакавіку 1942 года быў самы радасны — атрымаў паштоўку ад жонкі. Яна паведамляла, што знаходзіцца на Урале...

### 1943 год.

**18 лютага.** Пачалося наступленне... У вёску Жыткова Арлоўскай вобласці прыйшлі на світанні.

Пасярэдзіне вёскі вялікая плошча, абнесеная калючым дротам. За ёй — баракі, халодныя, брудныя і сырыя. Тут штодня ад голаду і холаду пamірала па некалькі дзясяткаў чырвонаармейцаў. Кармілі салдат баландай раз на дзень, а працавалі па 18—20 гадзін у суткі.

**5 ліпеня.** Пачалася Курская бітва. У паветры ўвесь дзень і ноч віднець зарыва агню.

**6 ліпеня.** Моцны масіраваны налёт нашых самалётаў на пярэдні нямецкі край. Гэтая ноч была падобная на парк з мільёнамі рознакаляровых агнёў.

**27 ліпеня.** Пераехалі ў вёску Гнілуша. Увесь вечар немцы кідалі на вёску снарады. Каб рабіць газету, прыйшлося перайсці ў бліндаж.

**6 жніўня.** Рэдакцыя пераехала ў пасёлак Надзежда. У пасёлку — ніводнага дома. Немцы ўсё спалілі за тое, што пчолы пакусалі салдат і іх коней.

**8 жніўня.** Я прадстаўлены да ўзнагароды — ордэна Айчыннай вайны 2-й ступені.

**12 жніўня.** Злучэнне перайшло да баявых спраў. Я пайшоў на пярэдні край па матэрыял. Па дарозе да КП усе вёскі спаленыя. Насельніцтва туліцца каля куч абгарэлага бярвення і цэглы. Ад вёсак Халодная Вада, Папартное нічога не засталося, усюды груды попелу, трупы мірных жыхароў.



«Месершмітт», збіты ў Будапешце, 1945 год. Фота з альбома Дзмітрыя Малевіча.

**28 верасня.** Пераправіўся цераз Днепр. Каб трапіць на КП, прыйшлося віхляць, як зайцу па скошаным лузе. Апошні прастрэльваўся немцамі штохвілінна. У адной з коп сена я знайшоў штаб палка і яго камандзіра — тав. Печанюка. Нягледзячы на абстаноўку (немец знаходзіўся за 150 метраў), камандзір, па ваеннай завядзёнцы, спытаў, ці еў я, і загадаў ад'ютанту прыгатаваць свежай рыбы. Яе тут было багата — за некалькі метраў працякаў сівы Дняпро.

Сабраўшы матэрыял, я адправіўся ў сваю часць. Ішоў тым жа лугам, толькі ўжо ноччу. Ішоў 28 кіламетраў. У вёсцы Сапонава Гута няма ні аднаго дома. Яшчэ дымяцца хаты, а ўжо чуваць стук сякер. Калгаснікі ўзводзяць новыя дамы.

**14 кастрычніка.** Дзень спакойны, пішу перадавіцу і збіраюся ў камандзіроўку. 17-га нашы войскі вызвалілі Лоеў. На поўдзень ад Лоева паспяхова фарсіравалі Дняпро і прарвалі абарону па фронце на 20 кіламетраў.

**27 кастрычніка.** У вёсцы Красілаўцы адбылася незвычайная сустрэча. Заходжу ў кватэру намесніка начальніка палітупраўлення фронту і замест таго, каб дакладваць аб прыбыцці, я, пераступіўшы парог хаты, прамовіў:

— Таварыш палкоўнік, вы не з Беларусі?

У адказ пачуў:

— А ты адкуль ведаеш?

— Мяркую па вашым сняданку. Бульбу ў мундзірах і салёныя агуркі ядуць толькі ў Беларусі.

— Ну, тады падсаджвайся да стала, — адказаў мне палкоўнік. Ён павярнуўся, і я пазнаю ў ім Лукашэвіча (пазней — сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР).

**14 снежня.** Еду ў 17-ы стралковы корпус. У вёсцы Стаўроўка сустрэў Аўдзюшына і Іофе — супрацоўнікаў «Советской Белоруссии»...

**31 снежня.** Новы год сустракаў у Аўдзюшына. Сабраліся ў адным ацалелым доміку. Ён быў настолькі маленькі, што прыйшлося сустракаць у дзве чаргі.

### 1944 год.

**24 студзеня.** Падпалкоўнік Чарняхоўскі выклікаў да сябе. Ён прама паставіў пытанне:

— Ведаеш танкі?

— Бачыў, таварыш падпалкоўнік.

— Нічога. Калі не ведаеш, то будзеш ведаць...

З гэтага дня я — літаратурны супрацоўнік газеты «Защитник Родины» 6-й танкавай арміі...

Паехаў да Сцяпана Фёдаравіча Шутава — земляка. Арыгінальны камандзір, смелы і адважны танкіст. Немцы ўвесь дзень бамбяць вёску Рыжанаўку. Калі ўзнікла яўная пагроза акружэння нямецкімі танкамі, Шутаў нацягвае зімовую шапку і кажа кіроўцу:

— Пайшлі, няма чаго тут сядзець.

Адбылася дзіўная карцінка. Немцы збіраліся акружыць савецкіх танкістаў, а атрымалася наадварот — Шутаў акружыў немцаў і задаў ім лазню. Аперацыя доўжылася не больш за гадзіну. Ён вярнуўся стомлены і брудны. Пераступаючы парог, звяртаючыся да мяне, сказаў:

— Паехалі. Ну іх к чорту, яшчэ заб'юць.

**2 ліпеня.** Войскі Ракасоўскага вызвалілі Вілейку, Смалявічы, Стоўбцы, Гарадзею, Нясвіж, перарэзалі дарогу Мінск — Вільня і чыгунку Мінск — Баранавічы.

**3 ліпеня.** Нашы войскі вызвалілі Мінск. Яго вызваленне, якое прадказвала хуткае вызваленне ўсёй Беларусі, — гэта вялікае, светлае свята беларускага народа...

У Лельчыцкім раёне немцы забілі 8 тысяч і сагналі ў Германію 3800 чалавек. З 7562 дамоў засталося толькі 32.

У Жлобіне, разбураным ушчэнт, жыхароў няма зусім.

У Мінску закатавана 120 тысяч жыхароў, у Бабруйску — 19 тысяч.

**17 ліпеня.** Немцы ў колькасці 57 600 убачылі Маскву. Толькі не тую Маскву, пра якую марылі гітлераўцы. Яны прайшлі па вуліцах як палонныя.

**20 ліпеня.** Замах на Гітлера. Абышлося апёкамі і ўдарамі. Яго не забілі, заб'ём мы.

**22 ліпеня.** 16 нямецкіх генералаў, якія здаліся ў палон, звярнуліся да генералаў і афіцэраў германскіх узброеных сіл: «Нашы апошнія баі і, асабліва, паражэнне цэнтральнай групы, якое канчаткова прадвызначыла зыход вайны, прывялі нас да поўнага пераканання ў безнадзейнасці далейшай барацьбы і тым схілілі нас выступіць з гэтым заклікам»...

Немцы назвалі Нёман «Лініяй катастрофы». Трэба меркаваць, для нас. Але выйшла, што тысячы абаронцаў «Лініі катастрофы» — салдаты ў халодных шэрых кіцелях, пайшлі на дно Нёмана, склалі галовы на беразе слаўнай гэтай ракі або пасля беспаспяховага супраціўлення паднялі рукі са словамі «капут».

**4 жніўня...** На новым паказальніку дарог «На Каўнас» нецярплівай рукой унізе напісана крэйдай: «І на Кёнігсберг, і на Берлін»...

**8 лістапада.** Слухаў сёння па радыё родны Мінск. Хочацца ў Беларусь. Надакучыла гэта «цывілізаваная» Еўропа.

**23 лістапада.** Загінуў брат Алесь. Абарвалася на 37-м годзе жыццё воіна, афіцэра, журналіста — актыўнага і бясстрашнага абаронцы Радзімы, аддагана камуніста. Загінуў прамы, чысты і высакароднай душы чалавек, незабыўны брат.

**31 снежня.** А 22-й гадзіне гвардыі маёр Іван Цімафеевіч Казлоў уручыў мне ордэн Чырвонай Зоркі за № 943482.

### 1945 год.

**13 лютага.** Нашы войскі, пасля паўтарамесячнай аблогі, скончылі ачышчэнне ад немцаў Будапешта.

**17 сакавіка.** Перайшоў блакітны Дунай. Стаў ён не блакітны. Кавалкі дошак, бярвёны плывуць па паверхні яго водаў... Зноў пачуў песню «кацюшы», гудзенне самалётаў.

**22 красавіка.** Знаходжуся ў Бернгардсталі. З вёскі толькі што сышлі немцы. Яны расказалі жыхарам, што бальшавікі з рагамі. І калі я ўвайшоў у дом, гаспадыня спытала:

— А біць нас будзеце?

**30 красавіка.** Загад аб узнагароджанні мяне ордэнам Айчыннай вайны 1-й ступені.

**12 мая.** Пры ўездзе ў Прагу жыхары выкочвалі на вуліцы бочкі з віном, півам, частавалі рускіх воінаў. Вуліцы ў гэты дзень былі чыста падмеценыя і палітыя вадой — гэта ў знак удзячнасці жыхароў воінам Савецкай арміі. «Нех жые Руда Армада!» — чулася з усіх бакоў...

**Падрыхтаваў**
**Аляксандр СЯВЕНКА, «Ваяр».**

***Поўны тэкст матэрыялу чытайце на сайце zviazda.by***



# КРОК ДА ТУМАННАГА АЛЬБІЁНА

**Геаграфічна Англія — гэта нібы Еўропа. І ў той жа час Еўропа своеасаблівая. Па-першае, туды няпроста патрапіць. І не толькі з прычыны фінансавага складніка — хоць дарога і пражыванне не слаба ўдараць па кашальку сярэдняга беларуса. Яшчэ і візу цяжка атрымаць. Дакументаў для яе патрэбна куды больш, чым на звычайны «шэнген». І каштуе віза, самая танная, пад 150 долараў. Праўда, даюць яе тэрмінам на паўгода і на некалькі паездак.**

А яшчэ, нягледзячы на наяўнасць візы ў пашпарце, вас па прылёце чакае абавязковая размова з прадстаўніком пагранічнай службы. І як быць чалавеку, калі не ведаеш англійскай мовы, — не ўяўляю. Перада мной дапытвалі кітаянку, якая ці мову не ведала, ці ў адказах блыталася. Якое выйсце знайшлі? Памежнік надыктоўваў ёй у тэлефон пытанні, яна іх адпраўляла знаёмым, тыя перакладалі, прысылалі назад. Дзяўчына канструявала адказ — пасылала назад, там ёй яго перакладалі. І так па крузе...

Галоўны сэнс пытанняў, што задаюць турыстам, — ці хопіць сродкаў на пражыванне, ці не маецца намеру застацца? А вось на выезде ніякіх пагранічных праверак няма, назад адсюль адпускаюць спакойна.

Прыляцеў я рана, аўтобус з аэрапорта ў горад, білет на які быў набыты загадзя, адпраўляўся значна пазней. Усё ж пакрочыў да адыходзячага цяпер транспарту: можа возьмеце? — Няма праблем, — адказаў кіроўца, амаль не глянуўшы на білет, — садзіся. А потым на міжгароднім аўтавакзале пры перасадцы білет наогул некуды заваліўся ў рукзаку. Сабраўся шукаць, але мяне спынілі. — Дакладна маецца білет? — пацікавіўся кантралёр. — Ну і добра, ідзіце і садзіцеся. І толькі ў спіну дадаў нечаканае: «Калі вы джэнтльмен».

Відаць, тут яшчэ давяраюць слову. Чуў, што нават іх суды часцяком вуснае абяцанне могуць прыраўняць да афіцыйнага дакумента ці заверанай даведкі. Зразумела, калі палічаць вас джэнтльменам, які ведае цану свайму слову.

Вялікабрытанія і да свайго знакамітага рэферэндуму аб выхадзе з ЕС была членам еўрапейскай сям'і з нацыянальнымі асаблівасцямі. Віза для ўезду сюды патрэбна свая. Грошы таксама ўласныя — фунт стэрлінгаў. Дарэчы, тут адны з першых увялі наяўныя пластыкавыя банкноты, якія не камечацца і не гараць нібыта. Я паспрабаваў пакамечыць іх пяцёрку — выраўноўвалася як новенькая. А вось падпальваць ужо не рызыкнуў, прабачце. Пра левабаковы рух на дарогах казаць залішне. Вельмі цяжка да яго прызвычаіцца, асабліва ў першыя дні.

А яшчэ тут пешаходы смела ідуць на чырвонае святло святлафора. Калі няма машын, зразумела. Адвыкшы ад мінскага парадку, пачаў так хадзіць і я. Аднойчы сабраўся перайсці дарогу на чырвонае ды тармазнуў, угледзеўшы побач траіх паліцэйскіх. Дык яны мяне самі ледзь не падштурхнулі — чаго марудзіш, маўляў. І самі пакрочылі. Тут святлафор папярэджвае, але не забараняе. А рызыкі і сваю адказнасць, калі што здарыцца, чалавек павінен вызначаць сам.

НАОГУЛ, Брытанія ставіцца да прыезджых прыязна. У тых, хто перавёз сюды сабраныя на радзіме мільярды, — зразумела, свая планета той прыязнасці. Існуюць цэлыя фірмы, якія абслугоўваюць іх запыты, дапамагаюць абжывацца і задавальняюць усе капрызы. Але і простаму турысту тут раздолле. І пра яго дбаюць. На вуліцах паўсюдна падрабязныя карты навакольнага раёна і блізкіх знакамітых турыстычных пунктаў — не заблукаеш. Многія ўстановы культуры, нават самыя шыкоўныя, зроблены бясплатнымі для наведвання. У тым ліку і славутыя Брытанскі музей, Музей імперыялістычных войнаў, Музей сучаснага мастацтва. Меркаваў, што за ўваход у Лонданскую карцінную галерэю з мяне нешта возьмуць. Але і там палюбаваўся творамі Манэ, Тыцыяна, Рэмбранта і «Сланечнікамі» Ван Гога — да «Сланечнікаў» давялося праз натоўп праціскацца — таксама за проста так. На знакамітую аглядную пляцоўку Скайгардэн (Нябесны сад) — адну з папулярных сучасных турыстычных «фішак» брытанскай сталіцы — таксама ўваход свабодны, толькі чаргу велізарную трэба выстаяць. Калі гарадскія ўлады прапаноўвалі гэты ўчастак пад бізнес-хмарачос, то выставілі інвестарам патрабаванне: не парушыць прыроду тэрыторыі. Але на месцы будоўлі быў сквэрык — як тут было будавацца? Але ж пабудаваліся. Сення сквэрык той квітнее, перанесены... на верхні паверх хмарачоса. Падзівіўся і я адтуль, з вышыні, на Лондан. І ў знак удзячнасці будаўнікам рашыў замовіць там, на даху пад аблокамі, крыху віна і кубачак кавы. Піў за іх здароўе і адносіны да свайго горада. Напоі ў рэстаране на даху Скай-гардэна каштавалі амаль столькі ж, колькі і ў звычайным вулічным кафэ.

У Лондане сёння ёсць і яшчэ адна цікавая новабудоўля — да ўсяго і з беларускім каларытам. Будынак беларускай мемарыяльнай царквы нават намінаваны на прэмію Сусветнага фестывалю архітэктуры — так званы Оскар у галіне архітэктуры. Ён прапанаваны адразу па дзвюх намінацыях — як сусветны рэлігійны будынак года і як прыклад найлепшага выкарыстання драўніны ў будоўлі. Праектаваў царкву брытанскі архітэктар Цзывай Со, які стаў яе вернікам.

У органах мясцовай улады тут ёсць чыноўнік, пасада якога гучыць як... кансультант па архітэктурнай эстэтыцы і шчасці. (Туды адбіраюць аўтарытэтных спецыялістаў з добрым мастацкім густам.) У абавязках яго — сачыць, каб любая новабудоўля не толькі інвестыцыі прыносіла ці працоўныя месцы стварала, але і прыгожай была, ландшафт не псавала, людзей радавала. (Эх, як патрэбны быў бы такі спецыяліст у нас — хоць бы для работы ў раёне Траецкага прадмесця ці сталічнага парка Горкага.)



ЗРАЗУМЕЛА, шмат размоў тут было і ёсць пра Брэксіт, пра распачаты выхад краіны з Еўрасаюза. Таксіст, які вёз па горадзе, прызнаўся, што ўся яго сям'я галасавала за выхад. Бо надта шмат эмігрантаў прыехала ў краіну. Пры галасаванні, праўда, была ўпэўненасць, што акажуцца ў меншасці. А яно вось як выйшла.



Калі б рэферэндум паўтарылі, магчыма, галасавалі б ужо інакш... Паліцэйскі сказаў, што быў катэгарычна супраць выхаду. Калісьці салдацкую службу праходзіў у Заходняй Германіі і ўсё планаваў паехаць прайсціся па мясцінах салдацкай маладосці. Цяпер жа, можа, і не атрымаецца такая паездка, калі збярэцца. А можа, і візы для яе спатрэбяцца, ужо англічане ад гэтага адвыклі.

Нашым землякам, што тут абжываюцца, вынікі рэферэндуму таксама неабыякавыя. А іх тут нямала. Ведаю, што толькі ў 2015 годзе і толькі па стыпендыях Еўрасаюза, навуковых фондаў ці саміх універсітэтаў у навучальных установах Вялікабрытаніі вучылася не менш за сотню нашых дзяўчат і юнакоў. Адольвалі беларусы нават прыступкі знакамітых Лонданскай школы эканомікі, Оксфардскага і Кембрыджскага ўніверсітэтаў — ВНУ сусветнай топ-дзясяткі. Вучыцца ў Англіі цяжка, але адукацыя таго вартая. Лынды біць няма калі. Студэнцкія бібліятэкі — і тыя працуюць кругласутачна, і нават глыбокай ноччу не пустуюць. Ніякіх паблажак на абставіны тут не даюць — краіне патрэбныя веды.

Нашы земляки тут найперш згадваюць Кірыла Чыкіюка і Арцёма Ставенку. Кірыл, апроч звычайнай універсітэцкай адукацыі, адолеў і аспірантуру кафедры фізікі ў Оксфардзе. Арцём адольвае аспірантуру Лонданскага ўніверсітэцкага каледжа (ЮсіЭл). Удвух яны зрабілі адкрыццё, за якім цяпер ганяюцца вядучыя вытворцы электронікі. Хлопцы прыдумалі, як утрымліваць выяву фармату тры джы ў адкрытай прасторы — што раней лічылася справай немагчымай. Калі Кірыл абараняў сваю вучоную ступень, то строгія оксфардскія прафесары не раз прасілі яго прыпыніцца — не паспявалі мэтры за ходам навуковых думак ураджэнца Брэста. У выніку строгі савет ацаніў яго працу як бліскучую. Шматабяцальным вучоным лічаць тут і Максіма Дадонава — выпускніка кафедры фізікі Кембрыджскага ўніверсітэта. А ў Лондане адным з найлепшых універсітэцкіх выкладчыкаў эканомікі прызнана мінчанка Юлія Карастылёва.

На Стаўбцоўшчыне ведаю бабульку, чый бацька ў 1939 годзе быў прызваны ў польскае войска на вайну з Германіяй і больш дахаты не вярнуўся. Толькі ў сямідзясятыя гады дайшлі да сваякоў пісьмы з Англіі, дзе ён абжыўся пасля службы ў войску. Там і памёр, ні разу дома ўжо не пабываўшы... Бабулька мяне ні аб чым не прасіла, але не паленаваўся я дабрацца да гарадка за сто кіламетраў ад Лондана і там прайшоў па адрасе, што быў пазначаны на старэнькім канверце з бабуліных скарбаў. Шмат часу прайшло пасля смерці нашага земляка, у доме жылі ўжо іншыя людзі. Але спадара Ліпніцкага там памятаюць. «Ён быў храбрым салдатам Другой сусветнай, героем бітвы пад Монтэ-Касіна», — распавялі мне жыхары суседніх дамоў.

АДЛЯТАЮЧЫ, у аэрапорце купіў і пагартаў адну з мясцовых газет. На бачным месцы там — распавед як дзевяностагадовая каралева ў сваю загарадную рэзідэнцыю ў Віндзары — туды, дзе нядаўна гулялі вяселле яе ўнука Гары — дабіраецца звычайнай электрычкай. І праз іншыя крокі Елізавета спрабуе эканоміць дзяржаўныя расходы на сваё ўтрыманне. І моцная яшчэ — у дажджлівае надвор'е на афіцыйных цырымоніях парасонік трымае сама.



**Вікенцій КЛЮЧНІК**





# ПЕСНІ ДЛЯ МАТУЛІ



Са старымі вясковымі музыкантамі адыходзіць эпоха самабытнай народнай культуры. Некалі гармaністы весялілі аднавяскоўцаў на вячорках, маёўках, кірмашах і фэстах, вяселлях і провадах у армію. Амаль у кожнай вёсцы быў свой, як раней казалі, «музыканцік», а калі не было — запрашалі альбо наймалі з суседняй вёскі. У песнях і танцах жыве народная душа.

Дзе тыя «першыя хлопцы на сяле» — народныя таленты, самабытныя вясковыя віртуозы, самародкі ігры на двухрадках? У якіх скрынях і шафах схаваны іхнія інструменты? На жаль, нам застаецца толькі ўспамінаць таленавітых вясковых музыкантаў...

Час ад часу я сустракаю саматужных гарманістаў з вёскі ў гарадскім асяродку. Урбанізацыя не «ўтаймавала» іхні талент, па-ранейшаму яны не страцілі вострае пачуццё народнай музыкі. Адзін з такіх — Уладзімір Паўловіч — былы мінскі жыхар, які дванаццаць гадоў таму вярнуўся на малую радзіму ў вёску Лозкі Навагрудскага раёна. Вярнуўся са сваім сябрам-спадарожнікам — гармонікам. Найгрышамі і песнямі ён весяліць сваю старэнькую маці. Па прафесіі сталяр мінскага вагоннага дэпо і завода «Гарызонт», ён ніколі не кідаў любімы занятак, удзельнічаў у конкурсах «Іграй, гармонік!». Цяпер Уладзімір Аляксеевіч — адзіны на ўвесь раён традыцыйны гарманіст, які ведае ўсе даўнейшыя танцы, народныя песні. Таму я і вырашыў запісаць яго ўспаміны і жывую музыку на відэа, зрабіць фотасесію ў родным доме і ў вясковых ваколіцах. ***На сайце zviazda.by можна паслухаць полькі, вальсы і іншыя танцавальныя мелодыі ў яго выкананні, паглядзець больш здымкаў і даведацца пра музычную «кар'еру» вясковага музыканта.***

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**



*Скарыстайцеся вашым смартфонам, каб адсканаваць QR-код і ўбачыць больш фота.*

## Открытый аукцион № 52/18 по продаже капитального строения по адресу: Минская область, Минский р-н, Папернянский с/с, д. Паперня, ул. Центральная, 20А

| | |
|---|---|
| Организатор аукциона | ООО «Реалконсалтинг», адрес: ул. Пономаренко 35А, пом. 701, каб. 8, г. Минск, 220015, Республика Беларусь, телефон/факс + 375 (17) 256-61-35 |

**Аукцион состоится 23.08.2018 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Пономаренко, 35А, пом. 701.** Продавец – Щурко А. С.

| № лота | Предмет аукциона | Местонахождение | Площадь, кв. м | Начальная цена продажи | Сумма задатка по лоту, руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Капитальное строение с инвентарным номером 600/С-72600, расположенное на земельном участке площадью 0,2081 га с кадастровым номером 623685507601000067.<br>Наименование – здание бани, назначение – здание специализированное иного назначения | Республика Беларусь, Минская область, Минский р-н, Папернянский с/с, д. Паперня, ул. Центральная, 20А | **296,3** | **70 000 долл. США*** | 10 000 |

* расчеты за приобретаемое имущество осуществляются в белорусских рублях по курсу НБРБ, установленному на дату проведения аукциона

| | |
|---|---|
| Порядок проведения и выбора победителя | Открытый аукцион на повышение начальной цены проводится с шагом аукциона в размере **5 процентов** от начальной стоимости предмета аукциона. Победителем объявляется участник аукциона, предложивший наиболее высокую цену. В случае когда в аукционе примет участие один участник либо на аукцион явится один участник (далее единственный участник), предмет аукциона продается этому участнику по начальной цене, увеличенной на 5 процентов, с его согласия |
| Прием заявлений | Заявления на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 9.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Пономаренко, 35А, пом. 701, каб. 8. **Последний день приема заявлений: 20.08.2018 до 17.00** |
| Задаток | Для участия в аукционе необходимо внести задаток (задатки) в вышеуказанном размере (в случае участия в торгах в отношении нескольких лотов – задаток вносится для каждого из предметов аукциона). Банковские реквизиты:<br>– для резидентов РБ задаток перечисляется в белорусских рублях Организатору аукциона на расчетный счет BY70SLAN30124358100130000000 в ЗАО «Банк ВТБ» (Беларусь), г. Минск, ул. Московская, 14, БИК SLANBY22;<br>– для нерезидентов РБ задаток перечисляется в валютном эквиваленте по курсу НБ РБ на дату платежа на следующие счета: в долларах США (USD) – расчетный счет BY28SLAN30124358150210000000 в ЗАО «Банк ВТБ» (Беларусь), г. Минск, ул. Московская, 14, БИК SLANBY22.<br>Получатель платежа: ООО «Реалконсалтинг», УНП 191302068.<br>Назначение платежа: «Задаток согласно Извещению о проведении аукциона № 52/18 по лоту № 1» |
| Затраты | Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона осуществляется победителем аукциона (единственным участником) по фактическим затратам, определенным в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукциона № 50/18. Победитель аукциона (единственный участник) обязан перечислить на текущий (расчетный) счет Организатора сумму затрат на организацию и проведение аукциона в белорусских рублях в течение 3 рабочих дней со дня его проведения |

1. Участнику, выигравшему аукцион, и единственному участнику сумма внесенного задатка учитывается в счет исполнения обязательств по договору, заключенному по результатам аукциона.
Участникам, не выигравшим аукцион, единственному участнику, не согласившемуся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 процентов, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.
2. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, о чем Организатором аукциона извещаются участники аукциона.
3. Срок подписания договора купли-продажи предмета аукциона – в течение 10 дней со дня проведения аукциона. Срок оплаты предмета аукциона по договору купли-продажи – в течение 20 дней со дня проведения аукциона, если стороны договора не договорятся об ином сроке

**КОНТАКТНАЯ ИНФОРМАЦИЯ ОРГАНИЗАТОРА АУКЦИОНА:** +375 (17) 256-61-35, +375 (25) 549-86-22, Игорь Садливский • auction@expertiza.by. Более подробную информацию и фото можно найти на сайте: http://www.expertiza.by

## Извещение о проведении электронных торгов

**Коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости» 22 августа 2018 г. в 11.30 на электронной торговой площадке «МИНСК – НЕДВИЖИМОСТЬ» (http://minskestate.by/) проводит электронные торги по продаже права заключения договоров аренды земельных участков в г. Минске. Предмет электронных торгов: право заключения договора аренды земельного участка сроком на 5 лет**

| № предмета аукциона | Месторасположение земельного участка | Кадастровый номер земельного участка | Площадь, га | Целевое назначение земельного участка / назначение земельного участка в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества | Начальная цена предмета аукциона, рублей | Сумма задатка, рублей | Расходы на подготовку документации для проведения аукциона, руб. | Отдельные условия, предусмотренные в решении Мингорисполкома об изъятии земельного участка для проведения аукциона и иные условия аукциона |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 |
| 1 | г. Минск в районе ул. Владислава Сырокомли | 500000000003005226 | 0,1500 | Для строительства объекта автосервиса в районе ул. Владислава Сырокомли в г. Минске / земельный участок для размещения объектов по ремонту и обслуживанию автомобилей (в том числе автомобильных заправочных и газонаполнительных станций) | 28 166,35 | 5 000,00 | 9 949,02 | Проектирование и строительство объекта осуществлять со следующими параметрами: объекты автосервиса не менее 50 %; магазин сопутствующих товаров, кафе, административные помещения; показатели по вместимости объектов строительства до 1400 кв. м общей площади возмещение открытому акционерному обществу «Щомыслица» убытки сельскохозяйственного производства в сумме 19,74 руб. с учетом нормативов, действующих на дату их фактического возмещения возмещение потерь сельскохозяйственного производства в сумме 398,59 рубля* |

* Потери сельскохозяйственного производства подлежат пересчету с учетом нормативов, действующих на дату их фактического возмещения.

**Продавец:** Минский городской исполнительный комитет, пр-т Независимости, 8, 220030, г. Минск, сайт: www.minsk.gov.by

**Организатор электронных торгов и оператор электронной торговой площадки:** Коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск, телефоны: (017) 226-16-72, 327-40-22, сайт: www.mgcn.by.

**Порядок проведения электронных торгов:** электронные торги проводятся в соответствии с **регламентом** информационной торговой системы ЭТП «МИНСК – НЕДВИЖИМОСТЬ» (далее – Регламент) с соблюдением требований Положения о порядке проведения электронных торгов по продаже государственного имущества, включая земельные участки, права заключения договора аренды государственного имущества, в том числе земельных участков, утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 608 (далее – Положение).

**Для участия в электронных торгах необходимо** ознакомиться с Регламентом, зарегистрироваться на сайте ЭТП по электронному адресу **http://minskestate.by**, пройти аккредитацию на ЭТП, внести задаток и подать документы на участие в торгах согласно информации об электронных торгах, размещенной на сайте ЭТП.

**Задаток** перечисляется на расчетный счет № BY34BPSB30121049710199330000 в Региональной Дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк» по г. Минску и Минской области, БИК BPSBBY2X, 220035, г. Минск, пр-т Машерова, д. 80, УНП 190398583, получатель – коммунальное унитарное предприятие «Минский городской центр недвижимости» (задаток вносится в белорусских рублях в сумме согласно настоящему извещению) не позже срока окончания приема документов на участие в электронных торгах – **17.08.2018 г.**

Дата и время начала проведения электронных торгов**: 22 августа 2018 года в 11.30** (по времени на сервере ЭТП «МИНСК – НЕДВИЖИМОСТЬ»).

**Победитель** электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, выразивший согласие на приобретение земельного участка по начальной цене, увеличенной на 5 % (претендент на покупку), в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах электронных торгов либо признания торгов несостоявшимися, до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка обязан:

– внести плату за предмет аукциона (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения);

– возместить Минскому горисполкому расходы по подготовке документации для проведения аукциона;

– возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в т. ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения;

– выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона.

После совершения названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, Минский горисполком на основании решения об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона и протокола о результатах аукциона либо протокола о признании аукциона несостоявшимся заключает с победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона **договор аренды земельного участка сроком на 5 лет**.

**Размер штрафа, уплачиваемого участником электронных торгов и (или) их победителем (претендентом на покупку) в случаях, предусмотренных законодательством и соглашением, составляет:**

по земельному участку для строительства объекта автосервиса в районе ул. Владислава Сырокомли в г. Минске 5 000,00 руб. (пять тысяч белорусских рублей).

**Прием заявлений** на участие в электронных торгах с прилагаемыми документами осуществляется **по 17.08.2018** включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 2, тел. (017) 2261672.

Детальная информация о порядке участия в электронных торгах размещена на сайте ЭТП «МИНСК-НЕДВИЖИМОСТЬ» **( http://minskestate.by).**

## ИЗВЕЩЕНИЕ
## о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Химремонт»

Аукцион состоится 30 июля 2018 г. в 11.00 по адресу: г. Гомель, ул. Луначарского 1-я, 67.

Аукционные торги проводятся в соответствии с Инструкцией о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов недвижимости и иного имущества, не относящегося к государственной собственности, а также аукционов на право заключения договоров аренды нежилых помещений, утвержденной приказом № 5а от 22.01.2014 г.

Первоначальное извещение о проведении торгов опубликовано в газете «Звязда» № 112 (28728) от 14.06.2018 г.

| № лота | Наименование предмета торгов, местонахождение имущества | Состав и краткая характеристика предмета торгов | Начальная цена, рублей (с НДС) | Задаток, рублей |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Комплекс объектов недвижимости и основных средств ОАО «Химремонт», расположенных по адресу: г. Гомель, ул. Добрушская, 47 | Состав комплекса включает:<br>капитальное строение с инвентарным номером 350/С-3387 (наименование: здание С-1; одноэтажное сборно-щитовое основное строение; общая площадь – 171,8 кв. м);<br>капитальное строение с инвентарным номером 350/С-3388 (наименование: контрольно-пропускной пункт; одноэтажное кирпичное основное строение; общая площадь – 7,1 кв. м);<br>капитальное строение с инвентарным номером 350/С-3389 (наименование: сарай; одноэтажное металлическое основное строение; общая площадь – 7,8 кв. м);<br>капитальное строение с инвентарным номером 350/С-3390 (наименование: склад; одноэтажное металлическое основное строение; общая площадь – 281,4 кв. м);<br>капитальное строение с инвентарным номером 350/С-3391 (наименование: уборная; одноэтажное дощатое основное строение; общая площадь – 3,1 кв. м);<br>капитальное строение с инвентарным номером 350/С-3392 (наименование: павильон; одноэтажное металлическое основное строение; общая площадь – 16,2 кв. м);<br>капитальное строение с инвентарным номером 350/С-3393 (наименование: гараж; одноэтажное металлическое основное строение, кирпичная, металлическая пристройки; общая площадь – 320,3 кв. м; ограждение (инв. № 200027, металлическая сетка на металлических столбах, в т. ч.: ограждение вокруг трансформатора (протяженность – 32,25 м); ограждение территории (протяженность – 45,3 м); бетонное покрытие (инв. № 6202223019, площадь – 650 кв. м);<br>капитальное строение с инвентарным номером 350/С-189229 (наименование: водопроводная сеть, электрическая сеть; год постройки – 1984; подземная водопроводная сеть, материал – сталь, протяженность – 121,2 м, ввод от городской водопроводной сети, количество колодцев – 3 шт.; подземная электрическая сеть, материал – алюминий, протяженность – 208,2 м, ввод от КТП-586);<br>прочее имущество: молниеотвод (инв. № 206080205), пожарная сигнализация (инв. № 470750203), охранная сигнализация (инв. № 6470710064), трансформатор КТП-586 (инв. № 6470713020).<br>Имущество расположено на земельном участке с кадастровым номером 340100000008000008 площадью 0,7039 га. Земельный участок предоставлен на праве постоянного пользования. Ограничения отсутствуют | 144 890,18 (снижена на 20 %) | 10 000,00 |

